WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

4 жніўня 2011 г.
ЧАЦВЕР
№ 146 (27010)
Кошт 700 рублёў

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«МАДЭРНІЗАЦЫЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ НІ Ў ЯКІМ ВЫПАДКУ НЕ ПАВІННА СПЫНІЦЦА»

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, наведваючы саўгас-камбінат «Горкі» ў Магілёўскай вобласці, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, аб'ёмы фінансавання сёння скарачаюцца, аднак за меншы кошт неабходна зрабіць усё тое, што планавалася. «Раскідвацца грашамі нельга. Грошы ніхто не друкуе. Тое фінансаванне, і ўзровень, і аб'ёмы, якія былі, пра іх трэба забыць адназначна, але задачы застаюцца. Таму за меншую цану трэба рабіць тое, што было намечана. Гэта прынцыпова і канцэптуальна. Спыніцца — значыць загубіць усё тое, што пачалі 7 гадоў таму. Гэтага дапусціць нельга», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Што датычыцца Горацкага раёна, то, на думку Прэзідэнта, ён павінен стаць узорам вядзення гаспадаркі.

Нарасціць тэмпы ўборкі збожжавых

Прэзідэнт паставіў задачу нарошчвання тэмпаў уборкі збожжавых культур. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, у гаспадарках пачынаецца адставанне ўборкі, зніжаюцца тэмпы. Для таго каб выправіць сітуацыю і ўбраць збожжа ў час, неабходна кожны дзень прыбаўляць да ўборкі па 2-2,5 працэнта.

«У гэтыя дні трэба нарошчваць тэмпы, інакш будзем страчваць ураджай. Збожжа ўжо ўсюды выспела», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, падкрэсліўшы, што паскораная работа павінна весціся не ва ўрон якасці.

Як далажыў кіраўніку дзяржавы міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Міхаіл Русы, на сераду ў краіне ўжо ўбрана 45 працэнтаў усіх плошчаў, намалочана звыш 4 млн.т. На думку міністра, у сельгаспрадпрыемствах вельмі рэальна атрымаць больш як 8 млн.т збожжа. Што датычыцца рапсу, то, на думку Прэзідэнта, назіраецца вельмі нізкая ўраджайнасць. «Гэта апошні год такой нядбайнасці. Калі мы не можам вырошчваць рапс, то лепш яго не сеяць. Што такое 16 ц/га? Павінна быць мінімум 25 ц/га. Гэта капрызная культура, таму трэба вызначыць палі, і дзе можна — сеяць, дзе нельга — не трэба настойваць. Таму што 16 ц/га — гэта не ўраджайнасць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускай сельгасакадэміі — новую праграму падрыхтоўкі кадраў

Прэзідэнт запатрабаваў абнавіць праграму падрыхтоўкі кадраў у Беларускай дзяржаўнай сельгасакадэміі ў Горках.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што адна з мэт яго рабочай паездкі ў Горацкі раён — звярнуць увагу на праблемы падрыхтоўкі сельгаскадраў у гэтай навучальнай установе. На яго думку, цяпер патрэбна сур'ёзная мадэрнізацыя навучальнага працэсу ў гэтай старэйшай сельскагаспадарчай ВНУ краіны, з тым каб аптымізаваць навучанне пад сучасныя патрабаванні.

Правядзенне ў наступным годзе ў Горках Магілёўскай вобласці рэспубліканскіх «Дажынак» — добрая прычына для таго, каб вырашыць многія праблемы, у тым ліку ў галіне сельскагаспадарчай адукацыі.

Падрыхтоўку кадраў у Беларускай сельгасакадэміі трэба вывесці хаця б на ўзровень мадэрнізаванай у краіне сельскай гаспадаркі, заявіў Прэзідэнт. Кадры для аграрнага сектара неабходна рыхтаваць у адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі і пад патрэбнасць аграрнага сектара краіны.

Горацкі раён павінен стаць базавым для падрыхтоўкі спецыялістаў у Беларускай сельгасакадэміі, лічыць Прэзідэнт. У працэсе навучання павінна быць больш практыкі. І было б мэтазгодна, каб практычныя навыкі студэнты атрымлівалі, магчыма, непасрэдна ў тых гаспадарках, куды яны затым прыедуць на работу. Прэзідэнт падкрэсліў, што літаральна з новага навучальнага года трэба ўводзіць навацыі ў ВНУ, выразна арыентуючыся на сучасныя патрэбы беларускага АПК. «Няхай рыхтуюць тых спецыялістаў, якія патрэбны. І калі, напрыклад, для падрыхтоўкі патрабуецца ўсяго 3-4 гады, то і праграму трэба скарачаць», — сказаў ён.

Новы цукровы завод можа быць пабудаваны ў Чавусах

У Беларусі ён стане пятым па ліку прадпрыемствам па выпуску цукру. Пабудаваць новае прадпрыемства невыпадкова плануецца менавіта ў Чавусах, паколькі тут плануюць пашыраць плошчы пад вырошчванне цукровых буракоў. Як праінфармавалі кіраўніка дзяржавы, усяго чатыры раёны Магілёўскай вобласці спецыялізуюцца на цукровых бураках. Выходзячы з лагістыкі дастаўкі сыравіны на будучы завод, Чавусы і выбраны месцам будаўніцтва. Як плануецца, за суткі на прадпрыемстве будзе перапрацоўвацца да 19 тыс.т цукровых буракоў.

Аляксандру Лукашэнку расказалі, што на будаўніцтва новага цукровага завода патрэбна будзе не менш як 360 млн еўра. Аб сваім намеры інвеставаць амаль 300 млн еўра ўжо заявілі польскія бізнэсмены. Абмяркоўваючы магчымасць будаўніцтва пятага па ліку ў краіне цукровага завода, Прэзідэнт сказаў, што, паколькі ёсць інвестары, трэба згаджацца будаваць новае прадпрыемства. Дарэчы, і Чавусы, калі тут пабудуюць сучасны цукровы завод, атрымаюць новае развіццё.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

МУЖЧЫНСКІЯ ГУЛЬНІ, або У «бой» ідуць толькі асы

Калі мужчыны кіруюць аўтамабілямі, марскімі суднамі і баявымі самалётамі, гэта ўспрымаецца як належнае і, бадай, наўрад ці выклікае асаблівую цікавасць. Іншая справа, калі дарослыя дзядзькі, як дзеці, гуляюць з машынкамі, караблікамі ці самалёцікамі. Калі для іх гэта — спартыўны азарт. І мужныя твары асвятляе шчодрая дзіцячая радасць ад захаплення.

СТАР. 4

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

КАЛЯ 20 УКРАІНСКІХ ВНУ НЕ АТРЫМАЛІ НІВОДНАЙ ЗАЯВЫ АД АБІТУРЫЕНТАЎ

Каля 20 украінскіх ВНУ сёлета не атрымалі ніводнай заявы ад абітурыентаў, амаль 200 вышэйшых навучальных устаноў выйшлі аўтсайдарамі цяперашняй уступнай кампаніі. Пра гэта заявіў міністр адукацыі і навукі, моладзі і спорту Украіны Дзмітрый Табачнік, падводзячы вынікі ўступнай кампаніі-2011, паведамляюць інфармагенцтвы.

Больш за 30 украінскіх вышэйшых навучальных устаноў атрымалі да 10 заяў і амаль у 130 ВНУ пададзена ўсяго да 100 заяў ад абітурыентаў. Міністр прапанаваў гэтым навучальным установам неадкладна шукаць шляхі аб'яднання з іншымі ВНУ ці вырашаць, што рабіць далей. Падчас цяперашняй уступнай кампаніі ўкраінскія абітурыенты аддалі перавагу вышэйшым навучальным установам тэхнічнага кірунку, а таксама матэматычным, інжынерным спецыяльнасцям.

«ДЭЙЛІ ТЭЛЕГРАФ» АБВЯСЦІЛА КАНЕЦ АМЕРЫКАНСКАГА ВЕКУ

Цяперашняе развіццё падзей вакол дзяржаўнага доўгу ЗША можа азначаць канец эпохі сусветнага дамінавання ЗША, вядомай як Амерыканскі Век, не толькі ў эканоміцы, але і ў ваеннай і дыпламатычнай сферах. Такая выснова ўтрымліваецца ў рэдакцыйным артыкуле лонданскай кансерватыўнай газеты «Дэйлі тэлеграф».

Апынуўшыся на грані дэфолту і няздольнасці выплачваць зарплату войскам, размешчаным у зоне баявых дзеянняў у Афганістане, «ЗША сутыкнуліся з новай геапалітычнай рэальнасцю — Вашынгтон страціў магчымасць быць сусветным жандарам», падкрэслівае выданне. Значная частка ўзгодненага скарачэння выдаткаў у памеры $2,4 трлн прыйдзецца на абаронны бюджэт.

«Запланаваны вывад амерыканскіх войскаў з Афганістана выкліканы ў значнай ступені фінансавымі прычынамі, нароўні з палітычнымі і ваеннымі, — піша выданне. — Паводле падлікаў былога супрацоўніка Пентагона, толькі пастаўкі і абслугоўванне кандыцыянераў у падраздзяленнях ЗША, змешчаных у Афганістане і Іраку, абыходзяцца бюджэту ў $20 млрд у год. Доўга працягвацца падобная сітуацыя не можа».

«Аднак заўсёды знойдуцца дзяржавы, якія гатовыя запоўніць вакуум, — падкрэслівае «Дэйлі тэлеграф». — Кітай ужо абвясціў, што павялічвае сёлета выдаткі на абарону на 12,7% да $91,6 млрд. У сваю чаргу Расія плануе выдаткаваць на абарону $648 млрд да 2020 года.

ДЫЕТА ПРЫМУШАЕ «ЕСЦІ» ЎЛАСНЫ МОЗГ

Амерыканскія навукоўцы прыйшлі да высновы, што ў людзей, якія «сядзяць» на дыеце, мозг змушаны паглынаць уласныя клеткі. Пры гэтым пачуццё голаду становіцца яшчэ мацнейшым.

Паводле даследавання, праведзенага ў медыцынскім каледжы Альберта Эйнштэйна ў Нью-Ёрку, як і іншыя часткі арганізма чалавека, клеткі галаўнога мозгу пачынаюць есці сябе, каб скарыстацца апошняй крыніцай энергіі для пераадолення наступстваў галадання. Такі працэс завецца аўтафагіяй, пры гэтым унутраныя кампаненты клеткі дэградуюць.

Прафілактычную акцыю «Хуткасць» праводзяць супрацоўнікі сталічнай ДАІ

Прафілактычную акцыю «Хуткасць» праводзяць з 3 па 13 жніўня супрацоўнікі сталічнай Дзяржаўтаінспекцыі. Як паведаміла карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе аддзела ДАІ Ленінскага РУУС Таццяна Красій, у гэтыя дні ў кожным раёне горада будуць дзейнічаць спецыялізаваныя мабільныя групы. У ходзе нагляду за дарожным рухам інспектары дарожна-патрульнай службы маюць намер выкарыстоўваць прыборы фота- і відэафіксацыі парушэнняў. Прычым у поле зроку супрацоўнікаў ДАІ будуць трапляць не толькі ліхачы, але і вадзіцелі-парушальнікі правіл праезду скрыжаванняў і пешаходных пераходаў, абгону і манеўравання. Разам з інспектарамі паблізу нерэгуляваных пераходаў, а таксама ў самых небяспечных месцах будуць несці службу дружыннікі ДАІ.

Жывыя і мёртвыя

Што рабіць з дрэвамі на могілках?

Напрыканцы мінулага тыдня моцны ўраган пранёсся па Белавежскай пушчы. Пагнула і папляжыла векавыя дрэвы на значнай плошчы. Зараз Нацыянальны парк падлічвае свой урон і расчышчае завалы. А ў навакольных раёнах людзі таксама адчулі адгалоскі прыроднай стыхіі, якая найбольш пашкодзіла дрэвы. На могілках вёскі Бельск Кобрынскага раёна бура паваліла паўдзясятка вялізных дрэў. Пашкодзіла помнікі, агароджы магіл. Адзін помнік наогул вялікае дрэва пры падзенні зрушыла з месца, а другое, падаючы, падперла яго. Так ён і стаіць, заціснуты двума паваленымі дрэвамі, збоку ад магілы. Вусцішная карціна. Цяпер сваякам пахаваных давядзецца выпраўляць наступствы ўрагану. А гэта сёння, як вядома, — немалыя затраты.

Дрэвы — праблема ці не большасці вясковых могілак. Так склалася здаўна, што на месцы апошняга спачыну людзей садзілі дрэвы або рабілі могілкі на высокіх мясцінах сярод рэдкага дрэвастою. У старых народных легендах нярэдка можна сустрэць сюжэт накшталт таго, што дваіх закаханых разлучылі, яны не вытрымалі гора, памерлі ці загінулі, і на іх агульнай магіле выраслі клён і бяроза, явар з калінаю або іншыя парныя дрэўцы. На магіле няўцешнай удавы часта вырастала вярба, на магіле воіна — моцны дубок. Традыцыі, апетыя ў фальклоры, таксама спрыяюць свядомасці, што дрэву самае месца над магілай блізкага альбо дарагога чалавека. Так было нармальна, пакуль на месцы пахавання ставілі толькі крыж, а ўсё добраўпарадкаванне зводзілася да прыборкі смецця, праполкі пустазелля ды развядзення кветак.

За апошнія дзясяцігоддзі сітуацыя рэзка памянялася. І на магілах паўсюль стаяць мармуровыя, гранітныя альбо іншыя помнікі. А на вясковых могілках кожнае пахаванне агароджваюць, раней — металічнай, цяпер каменнай агароджай. І дрэвы сталі сапраўднай пагрозай для такіх збудаванняў. Як гаварылася вышэй, бяроза альбо сасна падчас буры можа проста разбурыць надмагільныя пабудовы. Да таго ж дрэва становіцца пастаяннай крыніцай засмечвання добраўпарадкаваных пахаванняў. Лісты, ігліца, галінкі засыпаюць плітку, забіваюцца ў адтуліны паміж пліткамі, догляд магіл робіцца вельмі нялёгкай справай.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.08.2011 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
1 долар ЗША	4 972,00	1 чэшская крона	292,28	USD	27,8996
▲ 1 еўра	7 086,59	1 польскі злоты	1758,82	10 UAH	34,8841
1 латвійскі лат	9 998,99	▼ 1 расійскі рубель	178,21	10000 BYR	56,1022
1 літоўскі літ	2 054,42	1 украінская грыўня	621,64	EUR	39,5923

Раман БРОДАЎ:

«Доступ да валюты ва ўсіх суб'ектаў гаспадарання аднолькавы: валюта знаходзіцца за межамі нашай краіны»

Пра вынікі знешнегандлёвай дзейнасці Беларусі за першыя шэсць месяцаў 2011 года журналістам расказаў Раман БРОДАЎ, начальнік галоўнага ўпраўлення знешняй эканамічнай палітыкі Мінэканомікі.

Ён паведаміў, што за першае паўгоддзе сальда гандлю таварамі склала каля 4,5 мільярда долараў са знакам мінус, але папрасіў не экстрапаляваць гэтую лічбу на 2011 год у цэлым:

— Вядома, можна памножыць мінус 4,5 па паўгоддзі на два і атрымаць па годзе мінус дзевяць мільярдаў, але я адразу хацеў бы засцерагчы ад такіх падлікаў. Таму што тэндэнцыі і зрухі, якія былі ў першым паўгоддзі, яны аб'ектыўна ў нашай эканоміцы яшчэ не сустракаліся. І я мяркую, што, можа быць, і не сустрэнуцца. Змены спажывецкіх пераваг, ажыятажны попыт на некаторыя віды прадукцыі, змены ўмоў пастаўкі нафты — усё гэта фарміравала таварны і структурны зрухі, якіх у эканоміцы яшчэ не было, — адзначыў Раман Бродаў.

Наогул Раман Бродаў лічыць, што само па сабе адмоўнае сальда знешняга гандлю не з'яўляецца праблемным, а ў невялікіх памерах мае нават станоўчы эфект:

— Шмат якія эканомікі, якія мы ўспрымаем як паспяховыя, маюць традыцыйна адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі: Вялікабрытанія — звыш 140 мільярдаў долараў са знакам мінус (аднак да ВУП гэта складае 6-6,5%), Францыя — каля 60-70 мільярдаў (да ВУП — 2-3%), Польшча — 6 мільярдаў са знакам мінус (менеі за 1% да ВУП). Больш за тое, хачу сказаць, што адмоўнае сальда ў невялікіх памерах мае нават аздараўленчы эфект для эканомікі: для той эканомікі, якія развіваецца, гэта карысна. Таму прапаную глядзець не на абсалютныя лічбы, якія мы зафіксавалі па нейкім канкрэтным перыядзе, а на трэнды, якія складваюцца ў дынаміцы. А яны такія: у лютым сальда да ВУП было мінус 22%, а пачынаючы з лютага яно памесячна зніжалася і дасягнула ў маі 2,8% са знакам плюс. Нядрэнны вынік, пра які ўжо не раз узгадвалі.

Разам з тым ён адзначыў, што ў чэрвені гэты трэнд трохі спыніўся, але на гэта ёсць свае прычыны — увоз аўтамабіляў і тэхнічнае пераўзбраенне на адным з нафтаперапрацоўчых заводаў, з-за чаго быў запаволены экспарт светлых нафтапрадуктаў.

Дарэчы, калі казаць пра ўвоз аўтамабіляў з-за мяжы, то толькі за адзін чэрвень іх імпарт склаў каля 640 мільёнаў долараў. Раман Бродаў патлумачыў, што каб такую лічбу адпрацаваць у валюце, такому канцэрну як Беллегпрам неабходна працаваць на экспарт цэлы год.

Якім жа будзе прагноз Мінэканомікі наконт сальда гандлю таварамі за год? Раман Паўлавіч лічыць, што не больш за мінус 5,7-5,9 мільярда долараў:

— Мінэканомікі даволі-такі педантычна і акуратна падышло да гэтага пытання, мы вельмі асцярожна паглядзелі на кожную групу тавараў, на кожны напрамак, на кожны від, на вартасныя і фізічныя аб'ёмы, і наша ацэнка блізкая да таго, што вызначана ў прагнозе на 2011 год — 5,7-5,9 мільярдаў са знакам мінус.

Экспарт вырас з-за дэвальвацыі

Што тычыцца экспарту, то ў красавіку і ў маі ў Беларусі быў рэкордны аб'ём экспарту тавараў. Як адзначыў Раман Бродаў, такога экспарту тавараў ніколі не было за ўсю гісторыю суверэннай Беларусі — больш за 3,5 мільярда долараў. Але ў чэрвені гэты паказчык знізіўся, а прычынай стала ўжо згаданае пераўзбраенне на нафтаперапрацоўчым заводзе:

— І ў чэрвені мы б засталіся на тым жа ўзроўні, калі б не планавае пераўзбраенне НПЗ — экспарт у чэрвені склаў 3,35 мільярда долараў. Такім чынам, недзе 150 мільёнаў мы не дацягнулі да таго, каб застацца на рэкордным узроўні. Гэта добры вынік, які паказвае, што структурна эканоміка перабудоўваецца на экспарт у сваім дамінуючым значэнні. З паўгадавога сальда гандлю таварамі 67% было сфарміравана ў першым квартале, і толькі 33% — у другім. Гэта зноў паказвае на тое, што тэндэнцыя па яго мінімізацыі мае стабільны і прагназуемы характар.

Пры гэтым ён пагадзіўся, што такі вялікі аб'ём экспарту быў дасягнуты дзякуючы праведзенай нядаўна дэвальвацыі:

— Той фенаменальны аб'ём экспарту, які мы маем на працягу трох месяцаў, — гэта прамы вынік фактару дэвальвацыі. Мы праводзілі ацэнку праз апытанне і аналітычныя даследаванні наконт таго, як змяніліся планы суб'ектаў гаспадарання ў сувязі са зменай курсу валюты. І яны ацанілі дадатковы аб'ём экспарту ў памеры 6-6,5 млрд долараў па краіне за год. Гэта тыя дадатковыя аб'ёмы паставак, якія суб'екты бачаць у сувязі з тым, што змяніўся курс рубля.

Але яшчэ больш важным паказчыкам Раман Бродаў лічыць перавышэнне тэмпаў росту экспарту над тэмпамі росту імпарту:

— Па выніках 5 месяцаў мы канстатавалі, што ўпершыню за доўгі час тэмпы росту экспарту перавысілі тэмпы росту імпарту на 4,7 працэнтнага пункта. Павелічэнне гэтай вілкі захавалася і па выніках шасці месяцаў — гэты разрыў складае ўжо 8,7 працэнтнага пункта, — сказаў ён і дадаў, што такая тэндэнцыя назіраецца на ўсіх сегментах, незалежна ад геаграфічнай прыналежнасці. — Гэта добры вынік, які паказвае, што сітуацыя ў знешнеэканамічнай дзейнасці сапраўды стабілізуецца, што яна накіраваная на мінімізацыю сальда, а не на яго далейшае нарошчванне.

Начальнік галоўнага ўпраўлення знешняй эканамічнай палітыкі Мінэканомікі выказаў думку, што па выніках года разрыў паміж тэмпамі росту экспарту і імпарту складзе ўжо 14 працэнтных пунктаў, што дасць магчымасць «закончыць год з добрым падмуркам для стабільнага і ўпэўненага пачатку 2012 года не толькі для суб'ектаў гаспадарання, але і самой макраэканамічнай сітуацыі ў краіне».

Выказаўся Раман Бродаў і наконт так званага «валютнага голаду»:

— Мне могуць запярэчыць, што ўсе гэтыя тэндэнцыі дасягнуты ва ўмовах «валютнага голаду». Сапраўды, валютны рынак функцыяную трошкі па іншаму, не так, як прывыклі суб'екты гаспадарання. Але хацеў бы не пагадзіцца з меркаваннем некаторых экспертаў, якія заяўляюць, што доступ да валюты абмежаваны або яго маюць не ўсе суб'екты гаспадарання. Доступ да валюты ва ўсіх суб'ектаў гаспадарання аднолькавы: валюта знаходзіцца за межамі нашай краіны. І ўменне працаваць на знешніх рынках, уменне прадаваць прадукцыю і зарабляць валюту — гэта найважнейшы індыкатар канкурэнтаздольнасці суб'екта гаспадарання, галіны ў цэлым. Іншая справа, што на працягу апошніх гадоў цяплічныя ўмовы нацыянальнай эканомікі, стабільны курс нацыянальнай валюты стваралі камфортныя ўмовы для працы менавіта на ўнутраным рынку. І любое змяненне гэтых умоў, безумоўна, вымушае суб'екты гаспадарання перабудоўвацца для працы на знешні рынак. Не ўсе з гэтым спраўляюцца. Можна папракаць дзяржаўныя арганізацыі ў непаваротлівасці, пасіўнасці, нават у недастатковай эфектыўнасці, але факт застаецца фактам — 85% валютнай выручкі краіны генеруюць прадпрыемствы менавіта дзяржаўнай формы ўласнасці. Таму сваю задачу Мінэканомікі бачыць у тым, каб стварацца такія ўмовы, пры якіх будзе патрэбна і выгадна працаваць на знешнім рынку, пры якіх суб'екты гаспадарання будуць хацець выходзіць за межы нашай краіны і зарабляць валюту, мець доступ да яе, ажыццяўляць сваё развіццё.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Факт

ГАРАДСКОЕ КАРДЫЯХІРУРГІЧНАЕ АДДЗЯЛЕННЕ АДКРЫЛАСЯ Ў 9-Й СТАЛІЧНАЙ БАЛЬНІЦЫ

Кардыяхірургічнае аддзяленне пачало работу ў 9-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска.

— Гэта першае аддзяленне па аказанні медыцынскай дапамогі хворым кардыяхірургічнага профілю ў структуры камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, — расказала карэспандэнту агенцтва **«Мінск—Навіны»** начальнік аддзела спецыялізаванай медыцынскай дапамогі камітэта Алена Рудкова. — Раней мінчанам рабілі аперацыі на сэрцы ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры (РНПЦ) «Кардыялогія».

У структуры новага аддзялення 25 месцаў у палатах і 6 рэанімацыйных ложкаў, а таксама дзве аперацыйныя, забяспечаныя самым сучасным абсталяваннем, у тым ліку апаратамі штучнага кровазвароту. На яго базе будзе весціся і амбулаторны прыём: урачы пракансультуюць хворых без шпіталізацыі ў стацыянар.

«ЖЫГУЛІ» ЗНАЙШЛІ Ў ЛЕСЕ

Жыхар Наваполацка паведаміў у аддзел міліцыі Верхнядзвінскага раёна пра тое, што скралі ягоныя «Жыгулі» (аўтамабіль стаяў у двары дачнага дома ў вёсцы Новы Строй). Праз некалькі дзён пошукаў міліцыянеры знайшлі машыну ў лесе — аўто было разабрана на запасныя часткі. Устанавілі, што на злачынства пайшлі два маладыя рабочыя: аднаму — 22, а другому 20 гадоў. Заведзена крымінальная справа.

А жыхар Оршы паведаміў у міліцыю, што вечарам нехта падабраў ключ да ягонай машыны «БМВ», якая стаяла ля дома на вуліцы Леніна, і скраў навігатар і набор ключоў. Міліцыянеры ўпэўненыя, што на чорную справу пайшлі два беспрацоўныя мясцовыя жыхары, 1973 года нараджэння. Адзін са зладзеяў раней быў судзімы за махлярства.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗЛОДЗЕЙ НЕ ДРЭМЛЕ

З незачыненага памяшкання лесапільнага цэха ТАА «Буддэтальсэрвіс», якое знаходзіцца ў населеным пункце Бабовічы Калінкавіцкага раёна, знікла 8 электрарухавікоў, 30 літраў дызельнага паліва, 20 літраў антысэптыку. Спрыяльнай для крадзяжу сітуацыяй скарысталіся два жыхары Калінкавічаў. Частку незаконнай здабычы у іх паспелі канфіскаваць. А вось у складское памяшканне жыхара Рагачова невядомы злодзей пракраўся пасля таго, як сарваў навясны замок. Ён узяў 2 трансфарматары з вакуумнай устаноўкі, 300 м ацынкаванага тросу, 6 м меднага кабелю і 17 м меднага дроту.

ЗА МЕДАЛІ АДКАЖА

34-гадовы раней судзімы за вымагальніцтва жыхар Гомеля раніцай на вуліцы напаў на 45-гадовага мужчыну і сарваў медалі «Ветэран баявых дзеянняў» і «20 гадоў выводу савецкіх войскаў з Афганістана». На гэты раз злодзею інкрымінуецца рабаўніцтва.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

15 августа 2011 г. в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестская передвижная механизированная колонна № 1».
Повестка дня:
О перевыборах членов совета директоров общества.
Собрание будет проходить по адресу: г. Брест, ул. Белорусская, 51.
Начало регистрации в 10.30

УНП 200215539

У суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобл. паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **ГЛІННІКАВА Уладзіміра Пятровіча**, 18 мая 1959 года нараджэння, апошняе месца жыхарства — г. Рэчыца Гомельскай вобл., вул. М. Горкага, д. 58, кв. 4. Усім грамадзянам і юрыдычным асобам, якія маюць звесткі пра Глінніка ва Ул. П., просьба паведаміць іх суду Рэчыцкага раёна на працягу двух месяцаў на адрас: г. Рэчыца, вул. Леніна, 49.

Памерла выдатны беларускі вучоны ў галіне педагогікі і культуралогіі Ядвіга Грыгаровіч

Памерла выдатны беларускі вучоны ў галіне педагогікі і культуралогіі, доктар педагагічных навук, прафесар, былы рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь Ядвіга Грыгаровіч.

Яна нарадзілася 24 жніўня 1946 года ў вёсцы Даманова Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці. Яе творчае мысленне развівалася ў дзіцячай музычнай школе, пазней на літаратурна-музычным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Глыбокае ўсведамленне самакаштоўнасці мастацтва канчаткова сфарміравалася ў перыяд навучання ў аспірантуры Навукова-даследчага інстытута творчага выхавання Акадэміі педагагічных навук СССР (1971-1974 гг.)

Пасля паспяховай абароны кандыдацкай дысертацыі Ядвіга Грыгаровіч займалася даследаваннем прыроды і сутнасці эстэтычнага выхавання, шляхоў і сродкаў развіцця творчага мыслення, развіцця ўнікальнасці асобы. Вывады гэтых даследаванняў знайшлі адлюстраванне ў фундаментальнай манаграфіі «Эстэтычная накіраванасць асобы студэнта: педагагічны аспект» і доктарскай дысертацыі (2002 г.)

З'яўляючыся рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва, Ядвіга Грыгаровіч ініцыявала арыентаванне падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасцях, якія садзейнічалі фарміраванню эстэтычнага светапогляду, творчых поглядаў. Яна адстойвала ідэю актыўнага ўздзеяння мастацтва на чалавека.

Ядвіга Грыгаровіч унесла значны ўклад у развіццё творчай адукацыі. Пад яе кіраўніцтвам адбылася рэарганізацыя ўстановы адукацыі ва ўніверсітэт, які атрымаў статус вядучай ВНУ ў нацыянальнай сістэме адукацыі ў галіне культуры, стаў буйным навуковым і метадычным цэнтрам, а таксама захавальнікам і папулярызатарам культурнай спадчыны беларускага народа.

Ядвіга Грыгаровіч прымала актыўны ўдзел у грамадска-палітычным і культурным жыцці грамадства. З 2000 па 2004 год яна з'яўлялася намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па сацыяльных пытаннях Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Шматгадовая педагагічная і асветная дзейнасць, значны асабісты ўклад у айчынную культуру паставілі Ядвігу Грыгаровіч у адзін рад з вядучымі дзеячамі культуры і адукацыі Беларусі.

Светлая памяць аб Ядвізе Грыгаровіч — вучоным, кіраўніку, светлым і сціплым чалавеку — назаўсёды застанецца ў сэрцах яе родных і блізкіх, калег, шматлікіх сяброў і вучняў.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- ❖ Оценка оборудования и транспортных средств
- ❖ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- ❖ Независимая строительная экспертиза

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

№ лота	Наименование объекта/ Краткая характеристика объекта	Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	**Административно-хозяйственное здание** Одноэтажное кирпичное здание общ. площадью 265,3 кв.м, земельный участок 0,0733 га	195 959 240	19 595 930

Продавец имущества: Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Железнодорожного района, адрес объекта: **г. Гомель, пер. Строителей, 3.** Шаг торгов – 5%. Затраты на организацию аукциона оплачивает покупатель.

Срок подачи заявления	**До 17-00 16 августа 2011 г.**, по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46
Дата, время, место проведения аукциона	**17 августа 2011 г. в 10-00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, Гомельское областное управление Филиала РУП «Жилкоммунтехника» Центр «Белтехинвентаризация»
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012000511012 в ЗАО «Цептер Банк» ЦБУ 5, БИК 153001820, УНП 807000214
Условие пользования	Объекты продаются в собственность

Дополнительная информация по тел. 8 0232 75 06 63 (факс) www.bti.by

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- ❖ Оценка оборудования и транспортных средств
- ❖ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- ❖ Независимая строительная экспертиза

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

№ лота	Наименование объекта/ Краткая характеристика объекта	Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	**Гараж, инв. №350/С-106868** Общая площадь 36,9 кв.м.	53 828 280	5 382 828

Продавец имущества: Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации центрального района, адрес объекта: г. Гомель ул. Кожара, гараж №89, блок 2, ГСПК№19. Шаг торгов – 5%. Затраты на организацию аукциона оплачивает покупатель.

Срок подачи заявления	**До 17-00 16 августа 2011 г.**, по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46
Дата, время, место проведения аукциона	**17 августа 2011 г. в 12-00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, Гомельское областное управление Филиала РУП «Жилкоммунтехника» Центр «Белтехинвентаризация»
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012000511012 в ЗАО «Цептер Банк» ЦБУ 5, БИК 153001820, УНП 807000214
Условие пользования	Объекты продаются в собственность

Дополнительная информация по тел. 8 0232 75 06 63 (факс) www.bti.by

УЛАСНІКАМ ЗЯМЕЛЬНАГА ЎЧАСТКА Ў СТАЛІЦЫ МОЖНА СТАЦЬ ЗА 218 МЛН РУБЛЁЎ

Свабодныя зямельныя ўчасткі, размешчаныя ў Цэнтральным і Заводскім раёнах сталіцы, выстаўляць на аўкцыён для продажу ў прыватную ўласнасць. Стартавая цана на вакантныя соткі вагаецца ў межах 218—265 млн рублёў.

Як паведамілі карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» ў Мінскім гарадскім цэнтры нерухомасці, аўкцыённыя таргі пройдуць у бліжэйшы панядзелак (8 жніўня). Зацікаўленым у здзяйсненні падобных здзелак прапануюць 8 свабодных пляцовак.

— Гэта ўчасткі, размешчаныя на тэрыторыі сёння існуючай сядзібнай забудовы і ў катэджным пасёлку на месцы былой вёскі Цнянка, — удакладнілі ў цэнтры нерухомасці.

Спецыялісты адзначылі, што стартавая цана вакантных пляцовак будзе залежаць ад велічыні надзелу. У Заводскім раёне памер зямельных участкаў не перавышае 5—6 сотак, таму яна будзе ў межах 218—250 млн рублёў. Што тычыцца Цнянкі, то тут за ўчастак плошчай 0,06—0,07 га пачнуць таргавацца з больш высокай сумы — 230—265 млн рублёў.

На набытых у прыватную ўласнасць сотках гаспадарам можна будзе пабудаваць аднакватэрныя або блакаваныя жылыя дамы. Магчымасць купіць іх будзе толькі ў грамадзян Беларусі.

Наталля ВАВІЛАВА, «*Мінск—Навіны*».

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное производственное объединение «Минскстрой» 220050, г.Минск, ул.К.Маркса,13А

режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00-14.00, тел. 227 52 36, 226 03 01

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2005 по 2010 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

– ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 76, д. 78, пр. Рокоссовского, 80, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина, д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36, д. 38, ул. Матусевича д. 52 и др.

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

Объединение осуществляет строительство объекта «Строительство двух многоэтажных жилых домов типовых потребительских качеств в микрорайоне Сухарево-6 (в квартале ул. Академика Федорова - ул. Панченко - ул. Сухаревской). Жилой дом № 2 по генплану».

Свидетельство (удостоверение) № 500/451-3910 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 03 марта 2010 г.

Земельный участок площадью 0,0731 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание жилого дома запроектировано из двух секций, 9 этажным. Количество жилых помещений жилого дома – 72. Серия жилого дома – М 464-9-У1.

Начало строительства — апрель 2011 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – январь 2012 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 21.09.2010 № 1083-60/10 с дополнениями № 1297-60/10 от 03.11.2010.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить на строительство квартир с № 37 по № 72.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений с учетом выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет – 4 951 228 – для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 30.12.2010 № 45с-12-2010, генподрядчик – ОАО «МАПИД». Ожидаемый ввод жилого дома в эксплуатацию в соответствии с договором строительного подряда – декабрь 2011г.

Прием и регистрация заявлений на участие в долевом строительстве жилых помещений будет осуществляться со дня выхода проектной декларации в каб. 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

Генеральный директор Е.И. Вовна

ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин информирует акционеров о том, что выплата дивидендов за 2010 год будет производиться с 1 по 30 сентября 2011 года. Дивиденды на 1 акцию составляют 82,96 руб.

Выплата будет производиться зачислением на счета в ОАО «БПС-Банк» г. Жлобин.

Акционерам, приобретавшим акции общества в обмен на ИПЧ «Имущество», зачисление дивидендов производится на лицевые счета в филиалах ОАО «АСБ Беларусбанк» по месту заключения договора на приобретение акций и почтовыми переводами по месту жительства.

Список акционеров на получение дивидендов составляется по данным реестра владельцев ценных бумаг на 1 марта 2011 года.

Дирекция ОАО «БЕЛФА».

19.08.2011 г. в 12.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Татьяна».

Повестка дня:

1. О совершении сделок общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Гомель, ул. Павлова, 26.

Начало регистрации участников собрания: 12.00 УНП 400068248

Рынак жылля

МАСАВАЕ ПАТАННЕННЕ СТАЛІЧНЫХ КВАТЭР ПАЧНЕЦЦА ЎЖО Ў ВЕРАСНІ

Такое меркаванне выказаў нашай газеце вядомы эксперт — старшыня савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ

Сяргей КУРКАЧ

НАГАДАЮ, што другасны рынак жыллёвай нерухомасці «праваліўся» яшчэ ў сакавіку, калі пачаліся сур'ёзныя праблемы з валютай у абменніках. Менавіта тады для рыэлтараў пачаўся незапланаваны «мёртвы сезон», бо на рынку амаль нічога не прадавалася. Патэнцыйным пакупнікам жылля спатрэбілася 3—4 месяцы, каб адаптавацца да новых эканамічных умоў у краіне і пачаць зноў цікавіцца кватэрамі.

Цэны ўжо зніжаюцца

Цяпер сітуацыя змянілася, бо на працягу двух апошніх тыдняў на рынку назіраецца актывізацыя пакупнікоў, якія згодны набываць толькі таннае жыллё. Менавіта таму кватэры і пачалі паціху таннець, бо спрацаваў прынцып «даміно». Адна справа, калі на працягу некалькіх месяцаў толькі адзін кліент прапануе заплаціць за тваю кватэру малаватыя грошы і ты адмаўляешся, і зусім іншая сітуацыя складваецца, калі на працягу двух тыдняў ужо 10 патэнцыйных пакупнікоў катэгарычна патрабуюць сур'ёзныя зніжкі. А рэальных пакупнікоў з сур'ёзнымі грашыма сёння на рынку не хапае.

За два месяцы лета кватэры ўжо патаннелі на 1—2 тыс. USD

Паводле звестак інфармацыйнага каталога спецыялізаванага выдання «Нерухомасць Беларусі», сярэдні кошт квадратнага метра агульнай плошчы аднапакаёвых і двухпакаёвых кватэр складае 1380—1385 долараў. Назіраецца тэндэнцыя, калі кошт прапановы жыллёвага квадрата за тыдзень губляе каля 5—7 долараў. Пры рэальных здзелках назіраецца нават больш значнае патанненне, бо кватэры цяпер набываюцца толькі ў тым выпадку, калі квадратны метр будзе каштаваць не больш за 1230—1300 долараў.

На другасным рынку жылля сталіцы сёння існуе прапанова малых па плошчы аднапакаёвых кватэр. Падобнае жыллё агульнай плошчай да 30—34 квадратных метраў у старых пяціпавярховых дамах па вуліцах Казлова, Кабушкіна, Альшэўскага, Ангарскай і ў панэльных дамах у Шабанах цяпер прапануецца за 35—39 тысяч долараў. Яшчэ ў маі самыя танныя аднапакаёўкі там трымаліся ў дыяпазоне цэн ад 36 да 42 тысяч долараў.

Мікалай Прасталупаў адзначыў, што ў ліпені ў Мінску магчыма было набыць і ўвогуле даволі танныя кватэры. Так, напрыклад, усяго за 30 тысяч долараў была прададзена стандартная панэльная аднапакаёвая кватэра. Праўда, жыллё гэтае на першым паверсе і пасля невялікага пажару, але...

Цяпер самая вялікая колькасць прапановы аднапакаёвых кватэр мае цэннік у межах ад 40 да 52 тысяч долараў. Аднапакаёўкі коштам больш за 55 тысяч долараў сёння попытам увогуле не карыстаюцца.

У жніўні на сталічным рынку з'явілася шмат двухпакаёвых «хрушчовак» агульнай плошчай да 47 квадратных метраў, якія прапануюцца на продаж у дыяпазоне ад 44 да 50 тысяч долараў. А вось самы распаўсюджаны кошт стандартных двухпакаёвак адзначаны ў межах да 60 тысяч долараў. Існуюць у продажы і сапраўды якасныя двухпакаёвыя кватэры з палепшанай планіроўкай за 60—75 тысяч долараў. Сёння попыт на такое дарагое жыллё мінімальны.

Самыя слабенькія па якасці і метражы трохпакаёвыя кватэры (да 50 кв. м) прадаюцца па кошце ад 52 да 57 тысяч долараў. Яшчэ ў маі мінімальны цэннік трохпакаёвых «хрушчовак» пачынаўся з 58 тысяч долараў. Цяпер у продажы з'явілася дастатковая колькасць стандартных шматпакаёвых кватэр коштам ад 60 да 75 тысяч долараў. Трохпакаёвыя кватэры з палепшанай планіроўкай і плошчай каля 75 квадратных метраў прадаюцца да 85 тысяч долараў.

Долевае будаўніцтва па новых цэнах масаваму пакупніку не па кішэні

Нагадаю, што яшчэ ў красавіку—маі, калі ў краіне існавала мноства курсаў валюты, будучым уладальнікам жылля выгадней было набываць кватэры непасрэдна на першасным рынку жылля. На чорным рынку тады долар каштаваў каля 6 тысяч рублёў, а ў сістэме долевага будаўніцтва квадратны метр быў да 4,5—4,8 млн рублёў. Жыллёвы квадрат па рынкавым кошце валюты тады адпавядаў прыкладна 800 доларам.

Сёння камерцыйныя забудоўшчыкі прапануюць сваім кліентам ужо новыя цэны на жыллё ў новабудоўлях. Сярэдні кошт квадратнага метра жылля па лініі долевага будаўніцтва складае каля 1200 долараў. Увогуле рэальныя кошты па далёўцы залежаць ад статуса забудоўшчыка і мікрараёна новага жылля. Так, акцыянернае таварыства «Белбуд» прапануе долевае будаўніцтва ў мікрараёне «Каменная Горка-5», дзе квадратны метр кватэр у маналітна-каркасным доме каштуе каля 6 мільёнаў рублёў. У межах праекта «Мінск-Сіці» кошт квадратнага метра жылля ў 19-павярховых панэльных дамах па вуліцы Аэрадромная складае 6,3 млн рублёў.

У мікрараёне Уручча-6 па вуліцы Шафарнянскай на продаж прапануюцца толькі вялікія, трохпакаёвыя і чатырохпакаёвыя, кватэры па кошце 5,4 млн рублёў за квадратны метр.

Існуе і значна даражэйшае новае жыллё. У жылым квартале «Маскоўскі» кватэры прапануюцца па кошце ад 1330 да 1370 долараў за квадратны метр. А ў жылым комплексе «Дыпламат» па вул. Чарвякова жыллё каштуе ўжо 1400 долараў за кв. м.

Мікалай Прасталупаў упэўнены, што па такім кошце кватэр забудоўшчыку адшукаць неабходную колькасць кліентаў будзе праблематычна. Будаваць дамы за дарагія крэдытныя сродкі арганізатарам будзе ўвогуле нявыгадна. Менавіта таму забудоўшчыкі на працягу бліжэйшых 2—3 месяцаў будуць вымушаны арганізоўваць зніжкі на новае жыллё ў межах 10—15 працэнтаў.

Раней у сістэме долевага будаўніцтва масава выкарыстоўваліся льготныя крэдыты. Цяпер вядомая 101-я пастанова Мінгарвыканкама адменена канчаткова. У гэтым выпадку звычайныя чаргавікі будаваць сабе жыллё па 6—7 млн рублёў за жыллёвы квадрат проста не змогуць.

У студзені м² б/к кватэр будзе каштаваць менш за 1000 USD

Мікалай Прастулаў прагназуе, што пасля таго, як істотна патаннее ў валюце будаўніцтва камерцыйнага жылля, то следам ці паралельна будзе ажыццяўляцца зніжэнне цэннікаў на кватэры другаснага рынку жылля. Гэта будзе не вельмі хуткі і плаўны працэс. Магчымы кароткачасовыя ваганні коштаў у розныя бакі ў сувязі з павелічэннем попыту ці прапановы або пасля іншых нейкіх сацыяльна-эмацыянальных падзей, аднак... Галоўная тэндэнцыя застанецца на патанненне, бо заробкі ў валюце мы сталі атрымліваць значна меншыя, а кошт жыллёвых крэдытаў для большасці насельніцтва стаў вельмі дарагім.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мікалай Прасталупаў параіў бы цяпер прадаўцам больш лаяльна ставіцца да зніжак, калі на кватэру ёсць рэальны пакупнік з грашыма. Наш эксперт адзначыў, што цяпер, як і раней, за кватэры на другасным рынку жылля людзі разлічваюцца ў валюце. Тут трэба нагадаць, што большасць здзелак мае ланцуговы характар, калі пры продажы ўласнай кватэры кліент адначасова набывае сабе іншую. У гэтым выпадку галоўнае — мець розніцу паміж коштамі розных кватэр. Сёння, гэта ўжо не вельмі вялікая сума. А валюта ў жыхароў сталіцы сапраўды ёсць, аднак развіваюцца з ёю не так ахвотна, як раней, бо пакідаюць «заначку» на чорны дзень.

Так, я магчыма згаджуся з нашым экспертам, і сапраўды кватэры б/к у Мінску будуць таннець у бліжэйшыя 5 месяцаў. Аднак нашых чытачоў цікавіць, што будзе праз год ці два?

У перспектыве жыллё зноў пачне даражэць

Кіраўнік мінскага агенцтва нерухомасці «БелЦТН» Мікалай Прасталупаў адзначыў, што ў інфармацыйных каталогах сталіцы прысутнічае каля 5 тысяч кватэр, якія прапануюцца на продаж. Гэтыя спісы пастаянна абнаўляюцца. Раней, да крызісу, у год праз агенцтвы прадавалася каля 10 тысяч кватэр. Сёлета будзе крыху менш — прыкладна 7 тысяч здзелак.

Разам з тым, толькі згодна з санітарнымі нормамі, у Мінску маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў каля 280 тысяч сем'яў і грамадзян, яшчэ каля 200 тысяч сем'яў не маюць статуса чаргавіка, але жадаюць палепшыць свае жыллёвыя ўмовы.

М. Прасталупаў адзначыў у Мінску штогод рэгіструецца 10 тысяч новых сем'яў, якім патрэбна асобнае жыллё, а таксама фіксуецца недзе 8—10 тысяч скасаванняў шлюбаў, калі дадаткова неабходна вырашаць жыллёвае пытанне.

Атрымліваецца, што для паспяховага закрыцця жыллёвага пытання Мінску патрэбна 300—500 тысяч кватэр. Гэта нерэальна. Больш за тое, цяпер чыноўнікі будаўнічай галіны сталіцы спрабуюць рэальна ацэньваць свае магчымасці, таму прагназуюць істотнае скарачэнне аб'ёмаў будаўніцтва жылля ў Мінску — прыкладна да 500 тыс. кв. метраў у 2012 годзе. Мікалай Прасталупаў упэўнены, што калі гэта адбудзецца, то нерэалізаваны попыт на жыллё будзе назапашвацца. Сур'ёзны дэфіцыт новага жылля будзе спрыяць павелічэнню попыту на другасным рынку і падаражанню былых у карыстанні кватэр.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- **Оценка оборудования и транспортных средств**
- **Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности**
- **Независимая строительная экспертиза**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

№ лота	Наименование объекта/ Краткая характеристика объекта	Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	**Изолированное помещение** Производственный цех общ. площадью 753,0 кв.м.(инв.№350/B-D-149615)	464 320 080	46 432 008

Продавец имущества: Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Центрального района, адрес объекта: **г. Гомель, ул. Ильича, 286.** Шаг торгов – 5%. Затраты на организацию аукциона оплачивает покупатель.

Срок подачи заявления	**До 17-00 16 августа 2011 г.**, по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46
Дата, время, место проведения аукциона	**17 августа 2011 г. в 11-00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, Гомельское областное управление Филиала РУП «Жилкоммунтехника» Центр «Белтехинвентаризация»
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012000511012 в ЗАО «Цептер Банк» ЦБУ 5, БИК 153001820, УНП 807000214
Условие пользования	Объекты продаются в собственность

Дополнительная информация по тел. 8 0232 75 06 63 (факс) www.bti.by

Віктар ГАНЧАРЭНКА:

«Прапаную ўсім аказваць менш ціску на БАТЭ»

Барысаўскі БАТЭ паспяхова пераадолеў трэці раўнд кваліфікацыі Лігі чэмпіёнаў, атрымаўшы дома патрэбную (пасля гасцявой нічыёй) перамогу над літоўскім «Экранасам» — 3:1. Такім чынам, чэмпіён краіны выйшаў у плэй-оф, дзе яго чакае яшчэ два матчы. У выніку перамогі барысаўчане змогуць згуляць у групавым раўндзе Лігі чэмпіёнаў, паўтарыўшы поспех сезону-2008. У адваротным выпадку БАТЭ забяспечаны групавы этап Лігі Еўропы. Менавіта ў ім два апошнія сезоны і выступаў наш чэмпіён.

Фота БЕЛТА.

Віктар ГАНЧАРЭНКА пасля матчу адзначыў, што каманда справядліва прайшла ў плэй-оф, і ўсім прапанаваў не аказваць ціск на БАТЭ:

— Па суме двух матчаў наша перамога не выклікае сумненняў. Будзем лічыць, што мы былі лепшымі, нягледзячы на тое, што засталіся ў меншасці ў канцы першага тайма. Асаблівых момантаў каля нашых варот не ўзнікала, а ў контратакі мы беглі хутка, і адну выкарысталі. Лічу, мы па справе прайшлі ў наступны раўнд. Гульня была напружаная, адняла шмат нерваў у балельшчыкаў і трэнераў. Напэўна, у гэтым раўндзе па-іншаму і нельга — на коне стаіць вельмі шмат. Зараз каманда знаходзіцца пад вялікім ціскам. Усе чакаюць, каб мы добра выступілі. Прапаную ўсім аказваць менш ціску, а мы зробім усё магчымае, каб прайсці далей.

— Чакалі, што гульня будзе такой складанай?

— Цяжка планаваць выдаленне. Калі б не яно, гульня б склалася лягчэй.

— У перапынку вы давалі камандзе ўстаноўку гуляць ад абароны?

— Вядома. Мы крыху перастроіліся, улічваючы наша выдаленне. Але гэта была не толькі ўстаноўка на гульню ад абароны. Гаварылі і пра тое, як контратакаваць.

— Шкадуеце пра другую жоўтую картку Брэсана?

— Гэта эмоцыі. Усе кругом і навокал хадзілі, казалі, што Рэнан у Панявежысе не вельмі добра выглядаў. Магчыма, нейкія стрэлы ляцелі ў яго і пасля гульні ў Віцебску. Брэсан выходзіў на гэты матч з вялікім жаданнем. Напэўна, яно дзесьці перабрала меру. Першую картку складана каментаваць, другая — абсалютна заслужаная.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ШТО РАБІЦЬ З ДРЭВАМІ НА МОГІЛКАХ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Заканадаўствам нашай краіны на месцы пахавання дазваляецца садзіць толькі кустарнікавыя пароды і кветкі, а ў межах кварталаў пахаванняў дрэвы садзіць забаронена. Але адпаведны закон і пастанова Саўміна, якая зацвердзіла правілы ўтрымання могілак, былі прыняты ўжо ў бягучым стагоддзі. Дрэвы ж, як правіла, растуць на могілках даўно. І няма ніякага дакумента, які б абавязваў каго-небудзь тыя дрэвы зносіць.

Падчас адной з камандзіровак у Лунінецкі раён старшыня сельскага Савета расказвала мне, як яны вырашылі гэта пытанне ўсёй грамадой. На сельскім сходзе дамовіліся спілаваць усе дрэвы на могілках, а драўніну пусціць на агароджу вакол тэрыторыі могілак. І цяпер месца пахаванняў расчышчана, прыведзена ў парадак, а самі могілкі здалёк выглядаюць акуратна абгароджанымі і дагледжанымі. Лічу, што пададзены добры прыклад удалага вырашэння праблемы. Але дапускаю, што не вельмі шмат знойдзецца ахвотных выкарыстаць досвед названага сельсавета. У большасці сельвыканкамаў недастаткова грошай, каб наняць вопытных вальшчыкаў лесу. Пілаваць дрэвы вакол помнікаў нашмат цяжэй, чым валіць іх на лясной дзялянцы. Не кожны з кіраўнікоў сельскай улады адважыцца нават на адказнасць за такое мерапрыемства.

Калі праблема не пад сілу сельсавету, можа, варта пашукаць у іншых структурах ахвотных нарыхтаваць драўніну? Напрыклад, тыя арганізацыі, дзе робяць труны, маглі б пілаваць дрэвы. Вядома, валка драўніны абыдзецца даражэй, чым у лесе, але за дрэва плаціць не давядзецца. І ўсё роўна выйдзе эканомія. Лес цяпер значна падаражэў.

Для гэтага толькі неабходна прыняць адпаведныя пастановы хоць бы на ўзроўні аблвыканкамаў. А затым — прымаецца рашэнне мясцовага тэрытарыяльнага органа, каб усё ажыццяўляць у рамках законаў.

Хоць законы, варта адзначыць, у гэтай сувязі маюць яўныя супярэчнасці. Напрыклад, Палажэннем аб парадку выдалення аб'ектаў расліннага свету, размешчаных на землях населеных пунктаў, зацверджаным Саўмінам, прадугледжана, што любое дрэва ў населеным пункце можна спілаваць толькі з дазволу органа мясцовай улады. Могілкі ж, як правіла, размешчаны на тэрыторыі населеных пунктаў. А такі афіцыйны дакумент, як «Правілы ўтрымання месцаў пахавання» забараняе пасадку дрэў ля могілак і абавязвае грамадзян утрымліваць магілы і прылеглую тэрыторыю ў парадку за свой кошт.

З-за такіх вось супярэчнасцяў недарэчная сітуацыя склалася сёлета ў адной з вёсак Столінскага раёна. 80-гадовы пенсіянер узяў і спілаваў бярозу, што расла над магілай жонкі. Наўрад ці хто заўважыў бы гэты факт, але сусед па гарачых слядах напісаў заяву ў міліцыю. Міліцыя, як бывае ў такіх выпадках, накіравала паперы ў інспекцыю аховы прыроды. І закруцілася.

Вядома, дзядуля ніякай заявы не пісаў і дазволу не пытаўся. За гэта, паводле заканадаўства, яго павінны аштрафаваць, прынамсі спагнаць суму ўрону, нанесенага прыродзе. Сума гэтая складае сёння 420 000 рублёў.

Дачка пенсіянера абскардзіла рашэнне органа аховы прыроды ва ўсіх магчымых інстанцыях. І справа, наколькі мне вядома, перададзена ў суд. Варта адзначыць, што прыродаахоўныя органы прапаноўвалі кампраміснае выйсце з сітуацыі ў выглядзе кампенсацыі нанесенага ўрону пасадкай новых дрэў на тэрыторыі вёскі. Пайшлі на гэта з улікам узросту парушальніка прыродаахоўнага заканадаўства. Але другі бок прапанову не падтрымаў. У рэшце рэшт справу будзе вырашаць суд.

З-за адной спілаванай бярозы, якая расла не да месца, канфлікт дайшоў ужо ледзь не да Генеральнай пракуратуры. Як заўважыў адзін з работнікаў райінспекцыі аховы прыроды ў тэлефоннай размове з карэспандэнтам газеты, ніхто б таго пажылога чалавека не прыцягваў да адказнасці, каб не скарга ў міліцыю. А на скаргу ўстановы вымушаны рэагаваць у вызначаным парадку.

Вось і выйшла, што выйшла. А каб на могілках займаліся выдаленнем дрэў цэнтралізавана, ніякага канфлікту не было б. Дзядуля ж пілаваў тую злашчасную бярозу таму, што яна засмечвала магілу жонкі. А пра неабходнасць браць дазвол ён проста не ведаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Здарэнні

ВЫБУХНУЛА ПОМПАВАЯ СТАНЦЫЯ, ДВА ЧАЛАВЕКІ МОЦНА ПАЦЯРПЕЛІ

А восьмай гадзіне вечара 2 жніўня прагрымеў выбух на помпавай станцыі замежнага прадпрыемства «Ліндэ Газ Бел», якое знаходзіцца ў вёсцы Тэльмы каля Брэста. Узрыўной хваляй пабудова разбурана ўшчэнт, павалены сцены, дах ляжыць на зямлі. Супрацоўнікі МНС, якія прыбылі па выкліку, выцягнулі з-пад завалаў двух рабочых прадпрыемства. 33-гадовы мужчына і яго 25-гадовы брат атрымалі цяжкія траўмы і моцныя апёкі. Стан іх зараз ацэньваюць як стабільна цяжкі.

Паводле слоў памочніка начальніка ўпраўлення Брэсцкага абласнога МНС Сяргея МАШНОВА, зараз на месцы здарэння працуе міжведамасная камісія. Папярэдняй версіяй выбуху спецыялісты назвалі перавышэнне ў паветры будынка канцэнтрацыі газу ацэтылену.

Яна СВЕТАВА.

У МІНСКУ ПАДЧАС ПРАКЛАДКІ КАНАЛІЗАЦЫІ ЗАГІНУЎ РАБОЧЫ

Учора ў Мінску падчас пракладкі ліўневай каналізацыі па вуліцы Слабодскай двух рабочых засыпала зямлёй, адзін з іх загінуў.

Здарэнне адбылося ў 11 гадзін 18 хвілін. Падчас правядзення земляных работ па пракладцы ліўневай каналізацыі па вуліцы Слабодскай, 65 адбыўся абвал грунту ў траншэю. У выніку пад завалами на глыбіні трох метраў аказаліся слесары аварыйна-аднаўленчых работ прадпрыемства «Рэмаўтадор» — мужчыны 1972 г.н. і 1988 г.н., паведамляе прэс-служба МНС. Першага выратавальнікі дасталі з траўмай пазваночніка і грудной клеткі, ён дастаўлены ў бальніцу, у другога медыкі канстатавалі смерць. Па факце здарэння праводзіцца разбор.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ТРАКТАРЫСТ НАЕХАЎ НА СЯСТРУ

У Пастаўскім раёне ў адной з вёсак 24-гадовы хлопец, кіруючы трактарам «МТЗ-82», пры павароце выпадкова наехаў на сваю 14-гадовую сястру, якая ехала на веласіпедзе. Дзяўчынка, на жаль, загінула. Трагедыя адбылася каля пяці гадзін дня.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НА БУДОЎЛІ ЗАГІНУЎ МУЖЧЫНА

2 жніўня на будоўлі па вуліцы Матусевіча ў сталіцы загінуў 33-гадовы мінчанін.

Як паведаміў старшы памочнік пракурора Мінска Сяргей Балашаў, рабочы парушыў правілы тэхнікі бяспекі: не выключыўшы бетонамяшалку, хацеў яе адрамантаваць. Калі ён закрываў века, яго руку паветрам усмактала ўнутр машыны і адарвала. У выніку здарэння мужчына загінуў на месцы. Праверку праводзіць пракуратура Фрунзенскага раёна сталіцы.

Алена КРАВЕЦ.

МУЖЧЫНСКІЯ ГУЛЬНІ, або У «бой» ідуць толькі асы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

БАЧЫЦЬ адно гэта — сапраўдная асалода. А ўжо якія прыгожыя гэтыя цацачныя сродкі перасоўвання, як грацыёзна яны рухаюцца, манеўруюць, як імгненна набіраюць вышыню! Убачыць такое атрымліваецца не часта. Хіба на спаборніцтвах. Нядаўна на ўскрайку Мінска прайшоў этап еўрапейскага кубка па «паветраным баі» мадэляў-копій самалётаў часоў Першай і Другой сусветных войнаў.

Радыёкіруемыя мадэлі самалётаў на аэрадром у Баравую прывезлі аматары-канструктары з Масквы, Смаленска і Піцерскай Гатчыны, Кіева, Палтавы і Вінніцы, Кішынёва. Гэтая геаграфія, хай сабе і недалёкага замежжа, сведчыць, што захопленых стварэннем самалётаў на прасторах колішняй вялікай дзяржавы дагэтуль нямала. Але Беларусь лічыцца калыскай і лідарам нябесных спаборніцтваў-шоу. І па колькасці авіямадэлістаў таксама, а яны — з Мінска, Магілёва, Віцебска і Барысава. Удзельнікі «паветранага бою», як правіла, па адукацыі і абраных прафесіях — інжынеры альбо радыёэлектроншчыкі.



Але дакладна, што ўсе яны выраслі з авіямадэльных гурткоў. Сваімі рукамі робяць свае паветраныя судны. І яшчэ — усе яны выдатныя знаўцы гісторыі сусветнага самалётабудавання.

КАНДЫДАТ у майстры спорту барысаўчанін Віктар Трухан «хварэе» на маленькую авіяцыю з дзесяці гадоў. Самалёты робіць, лічы, на кухні. Ён — шматразовы чэмпіён Беларусі ў розных класах авіямадэляў. А ягоная копія-мадэль самалёта часоў Першай сусветнай вайны «Пфальц Е-5» стала пераможцам у паветраных баях з французскім «Ньюпардам», нямецкімі «Роландамі і «Фокерамі». У апошнім «баі» барысаўскі паветраны рыцар зведаў крушэнне і быў адпраўлены ў капітальны рамонт. На твары радыёпілота адбіўся сапраўдны сум. Хоць два дні перад гэтым ён быў непераможны. І было ад чаго расчуліцца.

— Наша захапленне нятаннае. Пабудаваць мадэль вымагае шмат часу і ад 300 да 500 долараў у пераводзе на замежную валюту. Ды і паездкі на спаборніцтвы ў іншыя краіны абыходзяцца не меней за 200 долараў. Звычайна авіямадэліст вязе з сабою не менш за тры самалёты, — кажа бывалы «лётчык» Віктар Трухан і дадае: — Але галоўнае тое, што калі ты захварэў на самалёты, дык гэта назаўсёды.

САМАМУ старэйшаму ўдзельніку спаборніцтваў, таксама барысаўчаніну, ідзе ўжо шосты дзясятак... Але азарт у Віктара Трусава — як у падлетка-пачаткоўца. Трэба толькі бачыць.

І паветраныя баі трэба бачыць. Дзясятак самалётаў у невялікай прасторы, але на імгненнай хуткасці ганяюцца адзін за адным, імкнуцца пратараніць. Як правіла, за дзесяць хвілін у нябеснай гонцы застаецца адно-два паветраныя судны. Яны і становяцца пераможцамі. Але ўзнагароды атрымліваюць радыёпілоты.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

І П'ЮЦЬ, І ЖНУЦЬ?

ДА 18 жніўня ў сельгасарганізацыях працягнецца месячнік кантролю за захаваннем патрабаванняў аховы працы і тэхнікі бяспекі пры масавых уборачных работах. Сумесна з сельскагаспадарчымі арганізацыямі органы ўнутраных спраў праводзяць, напрыклад, рэйдавыя мерапрыемствы па выяўленні якасці нясення службы вартавой аховы.

Паводле слоў **намесніка начальніка ўпраўлення прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў Алега КАРАЗЕЯ**, з пачатку года ў сельскай гаспадарцы выяўлена звыш 900 чалавек, якія ў рабочы час знаходзіліся на рабочым месцы ў стане алкагольнага ап'янення. Больш як 400 з гэтых 900 — вартаўнікі. Так, літаральна ў мінулым месяцы ў адным з сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Кіраўскага раёна, пакуль вартаўнік спаў пасля прыняцця алкагольнага напою, знікла шэсць акумулятараў ад камбайнаў. Наогул сёлета на прадпрыемствах аграпрамысловага комплексу зарэгістравана звыш 1000 крадзяжоў маёмасці. Дастаткова прыгадаць, як вясной органы аховы правапарадку падчас праверкі захавання аграхімікатаў выявілі шэраг фактаў адсутнасці усялякіх мер аховы. «Мы прапануем сельгаспрадпрыемствам заключаць дамоўленасці на ахову таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў з падраздзяленнямі Дэпартамента аховы, — кажа Алег Каразей. — Зараз у зоне дзеяння гэтых падраздзяленняў знаходзяцца каля 200 месцаў захавання аграхімікатаў, аднак менш за палову арганізацый заключылі адпаведныя дамоўленасці, а значыць, не забяспечваюць належнае захаванне маёмасці».

Сёлета па выяўленых фактах парушэнняў тэхнічнага ўмацавання, нясення вартавой аховы органы ўнутраных спраў вынеслі каля 500 прадстаўленняў аб ухіленні прычын і ўмоў, якія спрыяюць правапарушэнням. За адсутнасць разгляду апошніх звыш 80 кіраўнікоў гаспадарак прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасці.

Ніводнае сельскагаспадарчае прадпрыемства краіны не засталося без увагі супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі. Транспартныя сродкі абследуюцца, пры гэтым звяртаецца ўвага і на абазначэнне сельгастэхнікі святлоадбівальнымі элементамі. Паводле слоў **старшага інспектара ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі МУС Станіслава САЛАЎЯ**, выяўляюцца і кіроўцы, у тым ліку нават кіраўнікі СВК, якія выязджаюць на дарогу ў нецвярозым стане.

293 адзінкі тэхнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях суправаджае зараз уборку збожжа. Як адзначае **начальнік упраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Уладзімір РАФАЛЬСКІ**, на прадпрыемствах аграпрамысловага комплексу адбылося 54 пажары, у якіх загінулі два чалавекі. Матэрыяльныя страты пры гэтым склалі звыш 10 млрд рублёў. Гарэла 19 жывёлагадоўчых фермаў, 3 камбайны і 32 склады грубых кармоў. Асноўная прычына пажараў — чалавечы фактар, неасцярожнае абыходжанне з агнём, падпальванні, парушэнне правілаў бяспекі. Умовамі, якія спрыяюць узнікненню падобных сітуацый, з'яўляюцца, як правіла, адсутнасць вартавой аховы, магчымасць знаходжання на тэрыторыях старонніх асоб.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Печь отжига (2шт.) с инвентарными №№ 3892,3893	Печь отжига модель ПКГ 1323 2005 г.в.
Местонахождение объекта	г. Гродно, ул. Суворова, 40
Начальная цена продажи	166 806 000 белорусских рублей без учёта НДС.
Сумма задатка	8 340 300 белорусских рублей без учёта НДС.
ЛОТ 2	
Смеситель с инвентарным № 3338	Смеситель шихты СШ 1000 1976 г.в
Местонахождение объекта	г. Гродно, ул. Суворова, 40
Начальная цена продажи	15 253 000 белорусских рублей без учёта НДС.
Сумма задатка	762 650 белорусских рублей без учёта НДС.
ЛОТ 3	
Станок испытания абразивных кругов с инвентарным № 2782	Станок испытания абразивных кругов СИП 800, 2-камерный,1982 г.в.
Местонахождение объекта	г. Гродно, ул. Суворова, 40
Начальная цена продажи	4 749 000 белорусских рублей без учёта НДС.
Сумма задатка	237 450 белорусских рублей без учёта НДС.
Продавец	ОАО «Гродненский стеклозавод» г. Гродно, ул. Суворова, 40, тел.52-40-70»
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб.209, тел. 41-98-32
Условия аукциона	Без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/сч для перечисления задатка	Р/с 3012286350011 отделение № 201 г. Гродно ГФ по Гродненской области ОАО «Белинвестбанк» код банка 152101705, УНП 500833225

Аукцион состоится 8 сентября 2011 г. в 11.00
по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209

К участию в аукционе допускаются юридические лица, физические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

— заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

— *юридическим лицом — резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица, копии учредительных документов;

— *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

— *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

— представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

— физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

— представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.
Последний день приема заявлений – 7 сентября 2011 г. до 15.00.

Телефон для справок: 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
*дополнительная информация: **www.ino.by***

Занатоўкі мастака

ЧЫТАЧ І КНІГА

Апошнім часам мы ўсё больш чытаем з экранаў, усё меншае месца займае папяровая кніга са сваёю вагой, са сваімі фактурамі і водарамі. Таму мяне так уразіў чытач, які зайшоў у кнігарню, узяў са стала вялікі фотаальбом, разгарнуў, абнюхаў старонкі і выдыхнуў задаволенае «ву-у-ух». Водар нядаўна надрукаванай кнігі люблю з дзяцінства: маці ў бібліятэках працавала, а я ў іх рос.

ЗЛАМАНЫ ТЭЛЕФОН

Тэлефон зламаўся. Заціх, згас і не ўключыўся. Не ажыў. З кім не бывае. Калі пра каго іншага, дык і справядлівая заўвага. Усе ж з тэлефонамі ходзім. Усе пад тэлефоннымі вышкамі жывём. Але іншы — іншы, а ты — гэта ты. Гэта твой тэлефон сканаў. Змоўклі галасы любімых людзей. Згаслі партрэты з тварамі блізкіх. Працоўны працэс прыпыніўся. Ясна-ясна... Пабег, пераставіў сімку ў стары апарат, і праз якую гадзіну аднавіў сваю цэльнасць, хай не на ўсе сто адсоткаў, але на восемдзесят аднавіўся. І ўсё адно я не мог сам сабе не паспачуваць з такой нагоды, як смерць тэлефоннага апарата.

ПЕКЛА І МЕТРО

На тутэйшых прасторах вырасла цэлае пакаленне бацькоў, якія могуць крычаць дзецям, што тыя будуць гарэць у пекле. Адзін такі барадаты і доўгавалосы дзядзька крычаў сыну-падлетку пра пякельны агонь. Крычаў ён на станцыі метро «Плошча Перамогі», роў дурным голасам на хлопца, які гуляў на станцыі з футбольным мячом. Сын не слухаўся, пэўна, ён не баяўся падсмажыцца ў пекле. Тады барадач схапіў за руку жонку, страсянуў яе і сказаў сыну, што будзе біць ягоную маці, калі той не спыніць гульні з мячом. Жанчына пачала крычаць на сына, каб перадаў мячык бацьку, і адначасова, зрабіла спробу вырвацца. З трэцяй спробы яна вызвалілася і пабегла на другі канец станцыі. Хлопец перастаў біць мячык нагамі, падхапіў яго і шпурнуў у бацьку. Мяч трапіў акурат у доўгавалосую галаву, адскочыў і паляцеў на рэйкі. Барадач хрыпата засмяяўся, а ягоны сын заплакаў. У гэты момант падышла электрычка, усе дзейсныя асобы ў яе загрузіліся і паехалі ў бок станцыі «Кастрычніцкая». Мяч застаўся ляжаць за рэйкамі, на «Плошчы «Перамогі».

ВОЎКА І РАЗУМЕННЕ

«Разумееш, я не магу сказаць, што добра да цябе стаўлюся. Разумееш, усе казалі, якая ты скаціна, а я казаў, як і ўсе казалі. Усе абураліся тваімі паводзінамі, ну і я абураўся, разумееш? А тут раптам я ўсім скажу, што ты мой таварыш. Мяне ніхто не зразумее. Усе падумаюць, што я лгун». — «Скажы, што ты змяніў стаўленне да мяне. Раней кепска ставіўся, а цяпер — добра». — «Не магу. Ніяк не змагу, бо я жонцы і маці сваёй сказаў, што ты — свалата». — «Цяпер, Воўка, я цябе зразумеў. А насамрэч ты мяне паважаеш і любіш». — «Люблю і паважаю, ну ты ўсё разумееш».

ЖЭНІК І ВОЛЬГА

Жэнік паспрабаваў быў вылучыцца ў дэпутаты. Ніхто яму не прапаноўваў падтрымкі. Ніхто яму не раіў ісці на выбары ў гарсавет. Ніхто яго нават не натхняў на каляпалітычную дзейнасць. Сам! Сам выпхнуўся. Усё задумаў, запланаваў і пачаў здзяйсняць самастойна. Выглядала гэтая мітусня досыць камічна. З Жэніка пачалі пасмейвацца, пачалі кпіць, нават здзеклівыя выказванні загучалі ў бок самавылучэнца. Але самае дасціпнае і смешнае пра Жэніка напісала ягоная жонка Вольга: «Вадзіла Жэніка ў заасад. Паказвала яго малпам. Яны смяяліся». Чым бліжэй рабіліся выбары, тым больш жорстка людзі здзекаваліся з Жэніка. І тады ён выкарыстаў нечаканы прыём — пазваніў знаёмым і сказаў, што смяротна хворы, што ідзе на выбары, бо нічога і нікога больш не баіцца, бо губляць яму няма чаго. Жэніка пашкадавалі. На яго бурапенную дзейнасць і пустапарожнюю балбатню больш ніхто сур'ёзны не звяртаў увагу. Перад самымі выбарамі Жэнік зняў сваю кандыдатуру. Выбары прайшлі, пасля іх прайшлі яшчэ адны выбары, і яшчэ адны прайшлі. А Жэнік так і не памёр. Жэнік жыве. Хварэе, але жыве з Вольгаю, і памяраць у бліжэйшы час не збіраецца. Хай сабе жыве, толькі веры Жэніку больш няма і не будзе.

СЯРГЕЙ І ПАДМІНСК

Сяргей Малішэўскі з гонарам апавядаў, як ён схадзіў у бальніцу, і там высветлілася, што ў яго чыстыя лёгкія. «Вы што, у вёсцы жывяце?» — са здзіўленнем запытаў доктар. Сяргей з пачуццём уласнай годнасці паведаміў, што жыве ён пад Мінскам, у Раўбічах. Як на маё вока, дык адразу відаць, што Сяргей не жыве ў горадзе. Чаравікі ды нагавіцы дарожнай граззю пазаляпаныя. Загар на руках і твары сялянскі. Чарната пад пазногцямі. Але і вяскоўцам Сяргея Малішэўскага не назавеш. Ён жыхар каляталічны, наш — падмінскі. Такіх, не вясковых і не гарадскіх, ужо шмат, і выглядае на тое, што такіх падмінскіх будзе сярод нас яшчэ болей.

ПРЫГАЎ І КАЎБАСНЫЯ АБРЭЗКІ

Большасць нашых мастакоў любіла халтурыць. Паехаў на лета ў які Ніжнявартаўск ці ў якое Кемерава, нарабіў там скульптур ды роспісаў, атрымаў грошы, і год можна на іх пражыць, ажно да наступнага халтурнага сезона можна дацягнуць. Калі мае раўналеткі ды аднакурснікі лёталі ў Сібір, я працаваў на рэстаўрацыі касцельнага ды царкоўнага жывапісу ў Мсціславе. І бліжэй, і спакайней, і сытней... Вось што расказваў пра сваё агаладанне ў Брацку маскоўскі скульптар Прыгаў: «Нас прымацавалі да сталоўкі. Там харчаваліся спярша рабочыя, потым мы прыходзілі, даядалі. Што пазаставалася. Ежа называлася «рожкі з каўбаснымі абрэзкамі». (...) Так, з каўбаснымі абрэзкамі. Куды сама каўбаса ішла, я не ведаю, вось былі абрэзкі. Мы, значыць, прыходзілі пасля рабочых — нейкая дробная шушара, якая не ўваходзіць у склад рабочых. А пасля нас харчаваліся пенсіянеры, прымацаваныя да гэтай сталоўкі. Ім заставалася жудасная размазня з ражкоў, ужо без усялякіх абрэзкаў. Але дух нейкі заставаўся. («Дух каўбасных абрэзкаў!» — удакладняла Ірына Балабанава.) Так. Вось мы харчаваліся гэтымі абрэзкамі, і быў яшчэ хлеб. Не заўсёды, але мы неяк яго здабывалі. Увечары елі хлеб. З Масквы мы прывезлі з сабой кіпяцільнік і гарбату. Гэта было дзівоснае відовішча — поўная адсутнасць прадуктаў. І цяпер вось людзі, якія сумуюць па мінулым ладзе жыцця, мяне дзівяць: яны нібыта не памятаюць пра гэта? Не магу зразумець...» Не буду казаць, што ў тагачасным Мсціславе былі толькі выдатныя прадукты, але яны былі, і былі розныя. Майго заробку хапала, каб штодня абедаць у рэстарацыі «Віхра», а ў нядзелю хадзіць на кірмаш і купляць тамака ўсё самае смачнае і самае свежае.

АНЁЛ У МЕТРО

Лепей прайсціся, чым ехаць у метро, але ж едзем. Едуць усе. Я не лепшы. Вагоны поўныя. Як убіцца? З разгону! Падыходжу і заскокваю. Выдыхаю паветра. Сціскаюся. Дзверы зачыняюцца. Кранаемся. Едзем. Побач едзе бабулька з велізарным букетам бела-ружовых лілей. Сівагаловая бабулечка ўвесь час спрабуе тыцнуць букетам мне ў твар. Як магу адварочваюся і пачынаю клясці бабу страшнымі праклёнамі. А каб ты легла ў тую зямлю, з якой лілеі пазразала! Еду, кляну, і робіцца мне лёгка. І думаю я, што гэта не бабуля з букетам, а светлагаловы анёл вязе лілеі разам з добрымі весткамі. З такім анёльскім настроем і выйшаў я з вагона, і выехаў з-пад зямлі на свежае паветра.

Адам ГЛОБУС.

СХВАТКІ, або Што ў раддоме галоўнае?

КАЛІ вам вось-вось нараджаць, упэўнена, вы заклапочаны тым, у якім раддоме гэта лепей рабіць, дзе б знайсці самых лепшых урачоў... Аднак практыка сведчыць, што задумвацца трэба пра іншае. І ў першую чаргу — пра ўласны пазітыўны настрой. Ложак, на якім давядзецца ляжаць, прыбіральня, якую давядзецца наведваць, урач, які будзе недзе побач, калі ты будзеш тужыцца — усё гэта важна, але не настолькі, наколькі важны твой унутраны настрой на тое, што ўсё будзе добра, твае правільныя паводзіны, тваё жаданне навучацца новай ролі.

...Таццяна выслухала, пра што я хачу напісаць, і ўсміхнулася: «Думаю, я не тая, хто вам патрэбны... Ляжала на захаванні, ведала, што будзе кесарава. У аўторак павінна была паступіць на планавую аперацыю, аднак у панядзелак адышлі воды... Урачы спрацавалі вельмі хутка». Таццяна дае мне зразумець, што ўсё ў гэтым выпадку залежала ад урачоў, якім яна вельмі ўдзячна. Аднак паступова я разумею, што Таццяна — тая, хто мне патрэбны. Ёй 34 гады, яны з мужам доўга чакалі дзяцей, і іх хлопчык — Фёдар — нарэшце прыйшоў. Для маці гэта быў нялёгкі шлях. Аднак яна была фізічна і маральна гатовая да выканання ўсіх рэкамендацый урача, да з'яўлення шрама, да таго, што радзільня, у якой мусіць ляжаць, не новая, і што прыбіральня — не ў «нумары», а на паверсе... І вось зараз яна цярпліва чакае ўласнага аднаўлення. Малайчына! Чалавек, што называецца, настройваўся і атрымаў добры вынік.

Адзін урач, акушэр-гінеколаг, неяк сказала: колькі б родаў я ні прыняла за сваё жыццё, гэта не зрабіла мяне абсалютна спакойнай, калі нараджала мая дачка. І тым не менш, не будзем палохацца. Жанчына, якая збіраецца нарадзіць, не павінна зацыклівацца на шматлікіх страшных «расказах» пра тое, як «у адной знаёмай...». Яе задача — паглыбіцца ў тое, што рэкамендуюць урачы і пішуць у кампетэнтнай літаратуры.

У адной замежнай кніжцы пра дзетанараджэнне спецыялісты-прафесіяналы прыкладна такім чынам спрабуюць адукаваць будучых мамуляў: «Пры першай цяжарнасці ў цябе абавязкова ўзнікне пытанне: якім чынам распазнаць пачатак родаў? У галаве раяцца расказы і легенды аб жанчынах, якія нараджалі так хутка, што нават не паспявалі сабрацца ў радзільню, або пра тых, якія, прачнуўшыся раніцай, захацелі ў туалет, але не паспявалі ўстаць з ложка, як — плюх! — дзіця ўжо нарадзілася. Або прыгадваюцца сентыментальныя кадры кінафільмаў, у якіх цяжарная, пагладжваючы сябе па паясніцы, без цені спалоху на твары ціхім голасам паведамляе навакольным: «Ах, я нараджаю!»...». Тым самым аўтары даюць зразумець патэнцыйнай будучай маці, што ёй ёсць на чым засяродзіць увагу — на ведах, якія дапамогуць годна перажыць адзін з самых важных этапаў у жыцці, не нашкодзіць сваімі няправільнымі дзеяннямі ні сабе, ні дзіцяці. А для гэтага трэба ведаць, напрыклад, што заўсёды ёсць прыкметы, па якіх можна зразумець, што роды сапраўды пачаліся — «адыходжанне слізістай пробкі, каляплодных водаў і пачатак рэгулярных схватак». Не лішне будзе ведаць і пра падманныя схваткі, тры перыяды раскрыцця ды выгнанне плода.

«Натуральна, ты не раз спрабавала ўявіць сабе, якімі будуць твае роды. І калі ўсё адбываецца крыху інакш, ты перажываеш нешта накшталт расчаравання. Тым не менш, не варта рыхтавацца да горшага», — гаворыцца ў разумнай кнізе. Сапраўды, у родах ёсць нешта невытлумачальнае. Ну, вось чаму ў адных усё так цяжка, а іншыя — нібыта і не раджалі, а ў капусце дзіця знайшлі? Яшчэ старажытныя лекары гаварылі, што роды — наканаванне Божае...

Кожная парадзіха павінна ведаць і пра тое, што абязбольвальныя сродкі пранікаюць праз плацэнту да дзіцяці. Адчуванне вяласці і санлівасці, якое можа ўзнікнуць у выніку падобнага ўмяшання, праявіцца не толькі ў самой маці, але і ў дзіцяці, якому неабходна пераадолець цяжкі шлях, і калі ў гэты час яно будзе знаходзіцца пад уздзеяннем прэпаратаў, нарадзіцца сваімі сіламі і зрабіць першы ўдых будзе значна складаней.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Даследаванні паказалі, што ў дзяцей, чые маці падчас родаў знаходзіліся пад уздзеяннем абязбольвальных прэпаратаў, у першыя дні адзначалася запаволеная рэакцыя: яны слабей рэагавалі на гукі, пяшчоту і люлянне падчас плачу, горш бралі грудзі... У 1991 годзе вынікі сваіх работ апублікавала японская даследчыца Хаторы, якая даказала ўзаемасувязь паміж станам «змрочнага сну» ў парадзіх і развіццём у іх дзяцей аўтызму. Усе абязбольвальныя прэпараты аказваюць уплыў на дзіця. Таму спецыялісты заўсёды засцерагаюць: перш, чым прасіць урача даць таблетку ад болю, трэба падумаць. Праўда, думаць у момант схватак бывае цяжкавата. Вось чаму медыкі — двума рукамі «за» падрыхтоўку да родаў.

— Зараз пры жаночых кансультацыях, некаторых радзільнях і медцэнтрах ёсць спецыяльныя падрыхтоўчыя курсы да родаў, — расказвае **загадчыца акушэрска-абсервацыйнага аддзялення №2 3-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска Наталля САВАЦЕЕВА**. — Безумоўна, там можна атрымаць шмат карыснай інфармацыі. Сёння мы гаворым пра тое, што сучаснай сям'і, і ў першую чаргу жанчыне, якая будзе выношваць дзіця, неабходна рыхтавацца спачатку да зачацця, потым да выношвання, далей — да родаў, пазней — да грудзінога выкормлівання. Размова найперш ідзе пра атрыманне агульнага ўяўлення спачатку аб тым, якім павінен быць лад жыцця будучых бацькоў, калі яны жадаюць зачаць здаровае дзіця, далей аб тым, якім павінен быць лад жыцця будучай маці... Цяжарная — не хворая, і таму павінна жыць нармальным жыццём, аднак сёння мы назіраем, што некаторыя мамы не хочуць адмаўляцца ад курэння, яны няправільна харчуюцца, не прыпыняюць тэмп жыцця, не вытрымліваюць іншыя рэкамендацыі ўрача. Фактычна тут, у радзільні, мы маем справу з усімі тымі памылкамі, якія жанчына рабіла, пакуль расла, цяжарала і хадзіла цяжарнай...

Для таго, каб роды прайшлі як мага лепш, каб нарадзіць здаровае дзіця, трэба рыхтавацца. Пажадана, каб наступленне цяжарнасці не аказалася непрыемным сюрпрызам, каб жанчына яшчэ да зачацця добра ўсведамляла, што ніхто за яе не вынасіць і не народзіць. Большую частку работы ў родах выконвае сама парадзіха, а медработнікі ўсяго толькі знаходзяцца побач, каб адкарыгіраваць роды, якія пайшлі па «няправільным» сцэнарыі. Вядома ж, нікога ў радзільні не кідаюць у свабоднае плаванне. Урач, акушэрка заўсёды побач. Але трэба слухаць і выконваць іх рэкамендацыі. Трэба мець пэўны настрой, думаць пра тое, што неверагодны боль завяршаецца нараджэннем дзіцяці. Такі настрой будзе спрыяць правільным, адэкватным паводзінам падчас і пасля родаў...

...Радзільны дом №3 — 1956 года нараджэння. Старыя карпусы звонку і ўсярэдзіне выглядаюць дагледжана, паколькі не так даўно тут быў праведзены капрамонт. Аднак планіроўка засталася, зразумела, ранейшай, цеснаватай, так бы мовіць, эканом-клас. Раддом №3 — гэта адно аддзяленне паталогіі, дзе знаходзяцца жанчыны да родаў, адно непасрэдна родавае і тры пасляродавыя, або акушэрска-абсервацыйныя. На паверсе акушэрска-абсервацыйнага аддзялення №2 усе палаты занятыя. У іх — ад аднаго да шасці чалавек. Адначасова можа знаходзіцца не больш як 30 матуль з дзецьмі. На гэтую колькасць са старых часоў прадугледжаны ўсяго дзве душавыя і адна прыбіральня. Чэргаў ля іх я не заўважыла. Цікава, што апошняя акалічнасць (усё ж такі цяпер ёсць раддамы і з больш зручнымі бытавымі ўмовамі) не засмучае парадзіх. Больш за тое, некаторыя мінчанкі ігнаруюць тэрытарыяльны прынцып размяшчэння ў радзільнях і пішуць заяву на імя кіраўніка ўстановы, каб ім дазволілі нараджаць менавіта ў «тройцы».

Так паступіла і 23-гадовая Вольга: «Я павінна была нараджаць у 6-й бальніцы, дзе ляжала на захаванні, але знаёмыя неяк расказалі пра 3-ю клініку, і я прыйшла падпісваць абменную картку сюды». Вольга нарадзіла дзяўчынку Аліну. Баяцца не баялася, крычаць не крычала, бо рыхтавалася да нялёгкай справы. І выпісалася ўжо на трэці дзень...

У палатах давялося ўбачыць не толькі стомлена-шчаслівыя, але і стомлена-заплаканыя твары. Адна заплаканая ніяк не прыстасуецца да кармлення (падштурхнуць некаторых немаўлят да кармлення — задача не з лёгкіх), другая «перажывае» перапад гармонаў (усё ж такі пасля родаў у арганізме ідзе магутная гарманальная перабудова)... Гэта нармальная «карцінка». А вось — і «ненармальная»: адна дадумалася карміць стоячы, другая размаўляе па мабільным, калі дзіця прыкладзена да грудзей. Аб чым яны думаюць?

«Я прыслухоўваюся да таго, што мне кажуць у радзільні, — кажа 27-гадовая Таццяна, якая ў гэтыя дні нарадзіла другое дзіця. — А вось пасля выпіскі, дома, выконваю не ўсё, а толькі тое, што сама лічу карысным...». Наогул гэтыя, другія, роды ў Тані прайшлі хутка. Паводле яе слоў, урачы аказалі ёй вельмі добрую дапамогу: «У першую цяжарнасць я хадзіла на курсы маладой маці. Аднак усё роўна чамусьці была напалоханая цяжкімі родамі. На гэты раз я ўжо вельмі добра настроілася, і ўсё прайшло значна хутчэй — літаральна за гадзіну... Я не бачу праблемы ў тым, што ў палаце — шэсць чалавек. Затое прасцей абменьвацца вопытам... Тое, што душ і прыбіральня «адны на ўсіх», мяне непакоіць менш за ўсё... Тры-пяць дзён можна і патрыраджаць у 6-й бальніцы, дзе ляжала на захаванні, але знаёмыя неяк расказалі пра 3-ю клініку, і я прыйшла падпісваць абменную картку сюды». Вольга нарадзіла дзяўчынку Аліну. Баяцца не баялася, крычаць не крычала, бо рыхтавалася да нялёгкай справы. І выпісалася ўжо на трэці дзень...

У палатах давялося ўбачыць не толькі стомлена-шчаслівыя, але і стомлена-заплаканыя твары. Адна заплаканая ніяк не прыстасуецца да кармлення (падштурхнуць некаторых немаўлят да кармлення — задача не з лёгкіх), другая «перажывае» перапад гармонаў (усё ж такі пасля родаў у арганізме ідзе магутная гарманальная перабудова)... Гэта нармальная «карцінка». А вось — і «ненармальная»: адна дадумалася карміць стоячы, другая размаўляе па мабільным, калі дзіця прыкладзена да грудзей. Аб чым яны думаюць?

«Я прыслухоўваюся да таго, што мне кажуць у радзільні, — кажа 27-гадовая Таццяна, якая ў гэтыя дні нарадзіла другое дзіця. — А вось пасля выпіскі, дома, выконваю не ўсё, а толькі тое, што сама лічу карысным...». Наогул гэтыя, другія, роды ў Тані прайшлі хутка. Паводле яе слоў, урачы аказалі ёй вельмі добрую дапамогу: «У першую цяжарнасць я хадзіла на курсы маладой маці. Аднак усё роўна чамусьці была напалоханая цяжкімі родамі. На гэты раз я ўжо вельмі добра настроілася, і ўсё прайшло значна хутчэй — літаральна за гадзіну... Я не бачу праблемы ў тым, што ў палаце — шэсць чалавек. Затое прасцей абменьвацца вопытам... Тое, што душ і прыбіральня «адны на ўсіх», мяне непакоіць менш за ўсё... Тры-пяць дзён можна і патрыраджаць у 6-й бальніцы, дзе ляжала на захаванні, але знаёмыя неяк расказалі пра 3-ю клініку, і я прыйшла падпісваць абменную картку сюды». Вольга нарадзіла дзяўчынку Аліну. Баяцца не баялася, крычаць не крычала, бо рыхтавалася да нялёгкай справы. І выпісалася ўжо на трэці дзень...

У палатах давялося ўбачыць не толькі стомлена-шчаслівыя, але і стомлена-заплаканыя твары. Адна заплаканая ніяк не прыстасуецца да кармлення (падштурхнуць некаторых немаўлят да кармлення — задача не з лёгкіх), другая «перажывае» перапад гармонаў (усё ж такі пасля родаў у арганізме ідзе магутная гарманальная перабудова)... Гэта нармальная «карцінка». А вось — і «ненармальная»: адна дадумалася карміць стоячы, другая размаўляе па мабільным, калі дзіця прыкладзена да грудзей. Аб чым яны думаюць?

«Я прыслухоўваюся да таго, што мне кажуць у радзільні, — кажа 27-гадовая Таццяна, якая ў гэтыя дні нарадзіла другое дзіця. — А вось пасля выпіскі, дома, выконваю не ўсё, а толькі тое, што сама лічу карысным...». Наогул гэтыя, другія, роды ў Тані прайшлі хутка. Паводле яе слоў, урачы аказалі ёй вельмі добрую дапамогу: «У першую цяжарнасць я хадзіла на курсы маладой маці. Аднак усё роўна чамусьці была напалоханая цяжкімі родамі. На гэты раз я ўжо вельмі добра настроілася, і ўсё прайшло значна хутчэй — літаральна за гадзіну... Я не бачу праблемы ў тым, што ў палаце — шэсць чалавек. Затое прасцей абменьвацца вопытам... Тое, што душ і прыбіральня «адны на ўсіх», мяне непакоіць менш за ўсё... Тры-пяць дзён можна і патры-

Цяжарнасць, роды і пасляродавы перыяд мала агульнага маюць з «бязвоблачным ружовым шчасцем», якое будучая маці можа намаляваць сабе ў марах. Для таго, каб перажыць фізічную стомленасць, прывыкнуць і ўсвядоміць сябе маці, патрэбны час. І ўвесь гэты час варта падтрымліваць у сябе пазітыўны настрой, думаць пра тое, дзеля чаго «ўсё гэта». Іншых рэцэптаў лёгкіх родаў і шчаслівага мацярынства пакуль не прыдумана.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Да ведама

НОВЫ ФІТНЭС-ТРЭНД: БЕГАВАЯ ДАРОЖКА Ў ВАДЗЕ

Летні варыянт кардыятрэніроўкі распрацавалі ў ЗША: бегавую дарожку з трэнажорнай залы перанеслі ў басейн. Цікава, што падчас асвяжальнай трэніроўкі «спартсмен» адзеты не ў купальны касцюм і шлёпкі, а ў спартыўную форму для бегу і звычайныя красоўкі.

Паводле слоў экспертаў, гэта вельмі хуткі, бяспечны і эфектыўны спосаб скінуць лішнія кілаграмы і прыйсці ў форму. Справа ў тым, што звычайны бег можа траўмаваць цела: ёсць рызыка пашкоджанняў ног і пазваночніка. Вада ж змякчае нагрузку. Да таго ж супраціўленне вады прыводзіць да затраты вялікай колькасці энергіі. Параўнайце: падчас звычайнага бегу спальваецца прыкладна 8 калорый у хвіліну, а пры водным бегу — да 11,5 калорыі. Яшчэ адзін важны момант. Падчас трэніроўкі важна заставацца ў вертыкальным становішчы, а значыць, атрымліваецца трэніроўка на супраціўленне, якая прымушае працаваць мышцы ўсяго цела.

ТАМАТ ЗАМЕСТ СОНЦААХОЎНАГА КРЭМУ?

Каб дапамагчы скуры супрацьстаяць сонечнай радыяцыі, дастаткова з'ядаць у дзень усяго 5 лыжак таматнай пасты, сцвярджаюць брытанскія даследчыкі.

Як вядома, рэгулярнае ўздзеянне ўльтрафіялету выклікае дачаснае старэнне скуры, а ў самым горшым выпадку можа прывесці і да раку. Аўтары даследавання высветлілі, што антыаксідант лікапен, які змяшчаецца ў таматах, можа прадухіліць гэтыя праблемы.

Адна частка ўдзельнікаў даследавання штодзень атрымлівала па 55 грамаў (прыкладна 5 ст. лыжак) таматнай пасты і 10 грамаў аліўкавага алею (максімальная канцэнтрацыя лікапену дасягаецца менавіта ў таматах, якія прайшлі тэрмічную апрацоўку, а каб аблегчыць яго засваенне арганізмам, неабходная невялікая колькасць тлушчаў). Другая частка ўдзельнікаў атрымлівала проста аліўкавы алей. Праз тры месяцы высветлілася, што натуральная засцярога скуры ад ультрафіялету ва ўдзельнікаў першай групы на 33% лепшая, чым у другой, і практычна роўная той, што дае крэм з невялікім сонцаахоўным фактарам. Акрамя таго, у іх скуры значна павысіўся ўзровень пракалагену — рэчыва, якое захоўвае яе пругкасць. Тым не менш, даследчыкі падкрэсліваюць, што таматы — гэта дапаможны сродак, але ніяк не замена сонцаахоўных крэмаў.

СПЯВАЙЦЕ — КАБ ПАХУДЗЕЦЬ!

Даследчыкі з Гарвардскага ўніверсітэта сцвярджаюць, што спевы аказваюць дабратворнае ўздзеянне на арганізм. Пры гэтым не мае значэння, ці ёсць у чалавека музычны слых, добры голас і ці памятае ён словы песні на памяць.

Вучоныя правялі эксперымент у некалькіх клініках ЗША. Пацыентам было прапанавана часта спяваць. Высветлілася, што аматары рэгулярна напяваць мелодыі адчувалі аслабленне болю, хутчэй аднаўлялі сілы пасля хваробы. Акрамя таго, спецыялісты прыраўнавалі эфект ад спеваў да выканання фізічных практыкаванняў. Медыкі патлумачылі, што падчас спеваў арганізм чалавека абагачаецца кіслародам, што паляпшае кровазварот і тонус мышцаў, падтрымлівае работу сэрца і лёгкіх.

Дарэчы, з дапамогай вакалу ўрачы дапамагаюць пацыентам пазбавіцца ад заікання і наступстваў стрэсу.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Гэта цікава

ЧАЛАВЕК НЕ СТАНЕ БОЛЬШ РАЗУМНЫМ

Брытанскія навукоўцы высветлілі, што інтэлектуальнае развіццё чалавецтва дасягнула свайго піка, і для нас, з пункту гледжання законаў фізікі і фізіялогіі, немагчыма стаць яшчэ разумнейшымі.

Як устанавілі даследчыкі з Кембрыджскага ўніверсітэта, каб развівацца далей, мозг чалавека мае патрэбу ў велізарнай колькасці дадатковай энергіі і кіслароду, якія на дадзеным этапе проста немагчыма забяспечыць, паведамляе газета The Daily Mail.

Паводле слоў прафесара нейрабіялогіі Кембрыджскага ўніверсітэта Саймана Логліна, на мозг прыпадае ўсяго 2% ад агульнай вагі чалавека, у той час як на выкананне розных працэсаў ён спажывае каля 20% агульнай энергіі.

Ул. інф.

РУП «Речицкий комбинат строительных материалов» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже имущества, расположенного по адресу г. Речица, ул. Энергетиков, 1:

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена лота, без НДС, руб.	Задаток 5%, без НДС, руб.
1	Водонапорная башня, высотой 23.7 м, 1955 г	12 259 672	612 984
2	Здание бытовок главного производственного корпуса, одноэтажное кирпичное, 1996 г, 421 м²	24 064 600	1 203 230
3	Глинохранилище с приемным отделением, одноэтажное кирпичное здание, год постройки неустановлен, 860.8 м²	64 365 300	3 218 265

Организатор торгов: управляющий в деле о банкротстве ООО «Диспонент»: г. Гомель, ул. Шилова, 2, ком. 2, тел./факс (80232) 60-51-31.
Продавец: РУП «Речицкий КСМ», г. Речица, ул. Энергетиков, 1, тел. (802340) 5-40-27.
С имуществом можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 8.30 до 17.00.
Задаток перечисляется до 22.08.2011 г. (включительно), на р/с 3012001880014 ОАО «БПС-БАНК» г. Речица, код 151501356, УНП 400025042.
Условия продажи – без условий.
Шаг аукциона в размере 9% от начальной цены.
После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола.
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.
Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.
Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление установленной формы (подробности по тел.) с приложением: копии платежного поручения о внесении суммы задатка, для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лиц – копия паспорта либо иного документа, удостоверяющего личность.
Срок подачи заявления: с момента выхода настоящего объявления до 16:00. 23.08.2011 года по адресу: г. Речица, ул. Энергетиков, 1.
Дата, время, место проведения открытого аукциона: 23.08.2011 года в 14:00., г. Речица, ул. Энергетиков, 1.

По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8 029) 621 22 36 или (80232) 60 51 31.
Дополнительная информация: www.disponent.by

Слушныя парады

❒ Пасадка астраў у суседстве з петуніяй (праз рад) дапамагае у барацьбе з фузарыёзам.

❒ Для паспяховай барацьбы з драцянікам добрым папярэднікам бульбы з'яўляецца гарох, а для абароны ад цыбульнага каранёвага кляшча лепшыя папярэднікі — капуста, агуркі, таматы.

Жнівень дваякі, гатуе на стол зімовыя прысмакі

ЛЕТА працягваецца, але жнівень — пара, калі яно ідзе на спад. Якое надвор'е трэба чакаць у апошні месяц лета? Паводле народных назіранняў, пачатак месяца павінен быць дажджлівым. Мяркуйце самі: 1 жніўня — дзень Макрыны. Гэтае імя асацыюецца з макрэчай, дажджом, таму лічылі, што калі на Макрыны дождж, то астатак лета і восень будуць мокрыя, а калі суха, то і восень будзе сухая. 2 жніўня — у дзень прарока Ільі, не крыўдуйце на прыроду, бо нездарма ў народзе кажуць: «Прыйшоў Ілья — нарабіў гнілля». А 4 жніўня — Магдалена, дажджы, непагадзь не спыняюцца: «Магдалена — вады па калена». Там, дзе дазваляе надвор'е, трэба паклапаціцца пра ўраджай, які вырас на полі, у садзе, агародзе. Не забывайце пра народную мудрасць: «Хто ў жніўні гуляе, той зімой галадае».

У жніўні выбіраюць цыбулю-сеянку, калі палегла і пажаўцела яе лісце. Калі лісце цыбулі яшчэ зялёнае, а шыйка тоўстая — падрэжце яе карані. Убірайце зімовы часнок, кабачкі, патысоны, памідоры. Паліву і падкормкі патрабуюць морква і буракі. У якасці ўгнаенняў дарэчы будуць настоі зялёных траў, лістоў, пасынкаў таматаў, крапівы, а таксама драўніннага попелу. Набірае сілу позняя капуста. Для яе падкормкі таксама не будуць лішнімі. Лепш за ўсё падкарміць каравяком, а можна скарыстаць попел і мачавіну. У бочку на 200 літраў, якую вы падрыхтавалі для падкормкі пладовых дрэў, перад паліваам дабаўце дзве шклянкі мачавіны. Абрэжце пажоўклае лісце, выкарыстаўшы яго на корм жывёле, ці пакладзіце ў кампосную яму. У пачатку месяца працягвайце сеяць радыску, салату, кроп для асенняга выкарыстання. Не забудзьцеся насушыць пятрушкі, кропу, кінзы.

Летнія гатункі яблыкаў доўга не захоўваюцца, таму іх у першую чаргу трэба пусціць у справу: што на сок, што на сухафрукты, а больш за ўсё ўжываць у свежым выглядзе. Бо даказана і вучонымі, і практыкамі, што яблычак са свайго саду, няхай ён і не такі прыгожы, як той «чырванашчокі», які прадаецца на рынку (прывезены аднекуль здалёк і апрацаваны невядома чым), самы смачны і карысны. Яблыні, якія далі сёлета асабліва вялікі ўраджай, абавязкова падкарміце: на 200-літровую бочку вады — вядро драўніннага попелу. Няхай пастаіць дзён пяць, а пасля добра перамяшаўшы, паліваць у баразёнкі, зробленыя па перыметры кроны.

У гэтым месяцы пладовыя дрэвы заканчваюць свой рост. Для павышэння іх зімастойкасці падкарміце іх фосфарна-калійнымі ўгнаеннямі. Пры зборы яблыкаў майце пад рукой пілку, сякатар, каб адразу абразаць сухія і хворыя галінкі. Апад збірайце як мага часцей, каб не размнажаліся шкоднікі, лоўчыя паясы змочвайце ці пасыпайце сухім парашком хларафосу ці карбафосу. Трэба выразаць і лішнія парасткі ў ягадных кустоў, каб не забіралі сілкаванне. Выбракоўвайце кусты маліны, пашкоджаныя віруснымі хваробамі, зрэзвайце нажніцамі сцёблы, пашкоджаныя сцёблавай мухай. Выражце ўсе парасткі, якія перасталі пладаносіць.

У трэцяй дэкадзе, да канца месяца пачынайце пасадку адраўнелых чаранкоў чырвоных і белых парэчак. У больш познія тэрміны выконваць гэтую работу не варта: чаранкі ўкараняюцца намнога цяжэй. Калі вы не абрэзалі лішнія вусы і хворае лісце на сунічных градках, зрабіце гэта тэрмінова, выкапайце кусты, якія захварэлі, прадэзынфікуйце глебу, дзе яны раслі, а для прафілактыкі можна зрабіць гэта на ўсёй градцы.

Апрацоўвайце глебу, уносьце ўгнаенні, сейце сідэраты — карацей, думайце пра ўраджай наступнага года ўжо зараз.

Цыбуля на любы густ

КАЛІ вы пасадзіце ў сярэдзіне кастрычніка **рэпчатую цыбулю**, то ўжо ранняй вясной у вас на стале будзе вітаміннае зеляніва. Садзяць яе на градкі часта, адна да адной, цыбуліны крыху прыціскаюць і прысыпаюць невялікім слоем перагною і торфу. Калі надыдуць устойлівыя маразы, падсыпаюць пілавінне або перагной слоем да 6 см. Пасадачны матэрыял адбіраюць ужо пры ўборцы цыбулі-сеянкі (у канцы ліпеня — пачатку жніўня). Падыдуць толькі дробныя цыбулінкі дыяметрам да 1 см — іх высаджваюць позна ўвосень. Астатнюю цыбулю захоўваюць пры пакаёвай тэмпературы (15—20 градусаў) у сетках альбо заплятаюць у косы, каб пры пасадцы вясной яна не пайшла ў стрэлку. Перыядычна аглядаюць яе, выкідваюць цыбуліны, якія праараслі або падгнілі.

Пачынаючы са жніўня, не забывайце час ад часу абганяць **цыбулю-парэй**, каб да восені атрымаць тоўстае белае сцябло. Яна добра рэагуе на падкормкі попелам, зброджанай травой або разведзеным птушыным памётам (1:20) з дабаўленнем 1 ст. лыжкі поўнага мінеральнага ўгнаення на вядро вады.

Цыбулю-парэй можна пакінуць зімаваць у глебе, абагнаўшы і засыпаўшы торфам і лістотай. Гэта дае магчымасць пры адсутнасці вялікіх маразоў пакрыху яе выкопваць, калі гэта спатрэбіцца. Мяккую зіму яна перанясе добра, а ранняй вясной адрасце, і з вашай градкі атрымаеце цудоўны вітамінны зарад. Але большасць агароднікаў цыбулю-парэй выкопваюць у першай дэкадзе кастрычніка, крыху абразаюць карані, звязваюць у пучкі і ставяць у скрынках са слоем вільготнага пяску на дне (2—3 см) ушчыльную адна да адной, каб цалкам засыпаць ножку. Захоўваюць у падвале, склепе. У такім стане ножка паступова адбельваецца, у ёй павялічваецца колькасць вітамінаў. Можна таксама захоўваць цыбулю-парэй у халадзільніку ў поліэтыленавым пакеце.

Жнівень — лепшы час для размнажэння **шматгадовай цыбулі** шляхам дзялення кустоў. Дастаткова мець усяго 10 кустоў **шніт-цыбулі**, каб забяспечыць сям'ю свежым зеленівам з вясны да восені.

Пладова-ягадныя сокі

Сокі можна прыгатаваць з розных пладоў і закансерваваць у натуральным выглядзе без цукру ці з ім. Для сокаў прыдатныя плады любых памераў, абавязковая ўмова — добрая якасць, без чарвяточын і не падгнілыя.

Каб сок было лягчэй аддзяліць пры адцісканні, здрабніце плады і ягады да кашападобнай масы. Гэта можна зрабіць з дапамогай мясарубкі з буйнаячэістай рашоткай. Маліны і клубніцы, прамытыя пад душам, растаўчыце ў каструлі, каб не засталося цэлых ягад.

Слівы і чорныя парэчкі з цяжкасцю аддаюць сок. Гэтыя плады пасля драбнення змясціце ў эмаляваную каструлю, дабаўце вады з разліку 1 л на 8 кг мязгі і нагрэйце да тэмпературы 60 градусаў. Сок можна адціснуць на сокавыціскалцы ці ручным прэсе. Перад кансерваваннем сок трэба прафільтраваць праз тканіну, а затым даць яму адстаяцца ў халодным месцы. Пасля фільтрацыі сок падагрэйце ў эмаляванай каструлі да тэмпературы 80—85 градусаў і разліце ў слоікі, накрыйце накрыўкамі і пастэрылізуйце ў гарачай вадзе (85 градусаў) на працягу 15—20 хвілін. Калі вы хочаце атрымаць сок і піць яго адразу, дабаўце цукар. У сок з вішань дабаўляйце цукар да 20 працэнтаў, у сок са сліў — да 10 працэнтаў, у малінавы — да 15 працэнтаў. Добрыя празрыстыя сокі атрымліваюцца з чорных і чырвоных парэчак, малін, вішань.

Сокі з мякаццю змяшчаюць яшчэ і здробненую пладовую мякаць. Такія сокі больш багатыя на вітаміны і больш карысныя.

Суніцы з градкі на градку

СУНІЦЫ даюць добры ўраджай толькі ў першыя тры гады. Потым кусты старэюць, глеба бяднее, у ёй назапашваюцца шкоднікі і ўзбуджальнікі хвароб, таксама пустазелле (пырнік), якое цяжка вывесці. Адзін з галоўных сакрэтаў высокіх ураджаяў суніц — чаргаванне культур. У якасці папярэднікаў рэкамендуецца цыбуля, часнок, морква, сталовыя буракі, салата, кроп, з сідэратаў — віка, люцэрна. На глебе, не заражанай нематодамі, суніцы можна размясціць пасля фасолі і гароху. Іх не трэба садзіць на градках, дзе да гэтага раслі гуркі, перац, баклажаны, бульба, лілеі, астры, гладыёлусы — у гэтым выпадку расліна можа пашкоджвацца фузарыёзам. Зусім не лепшае месца для суніц — участак пасля раскарчоўкі дрэў або кустоў: тут вельмі актыўна развіваюцца каранёвыя гнілі. Але калі няма іншага выйсця, на такім участку выбіраюць з зямлі ўсе карані і высяваюць рапс, гарчыцу, іншыя крыжакветныя культуры. У пачатку цвіцення гэтых раслін іх скошваюць і здробленую зялёную масу закопваюць у глебе.

Самыя буйныя і прыгожыя ягады бываюць на адна-двухгадовых кустах суніц, таму ў садзе пажадана мець адначасова тры-чатыры рознаўзроставыя градкі.

Сакрэт ураджайнасці суніц і ёсць у перамяшчэнні іх з градкі на градку: першую градку зоймуць суніцы, якія толькі што пасадзілі, другую — суніцы першага года пладанашэння, трэцюю — якія пладаносяць другі год. Градку з суніцамі, якія плоданосяць трэці год, пакідаюць толькі ў тым выпадку, калі расліны ў добрым стане, або пасля амаладжэння кустоў.

Жнівеньскія клопаты агародніка

Яшчэ не позна зрабіць апошняе прарэджванне моркві. Вырваную моркву трэба вынесці з градкі, каб муха, якая чуе пах бацвіння, не нашкодзіла.

Гарбузы і кабачкі адчуваюць сябе добра. Калі першыя толькі нарошчваюць масу, то другія ўжо стаміліся фарміраваць плады. Трэба, каб на кусце выспявала не больш як два кабачкі і не больш як тры гарбузы, астатнія завязі выразаць. Лішак толькі затрымлівае іх выспяванне. Можна падкарміць настоем каравяку (1:5), конскага гною (1:7), птушынага памёту (1:10) — пад кожную расліну выліць да трох-чатырох літраў.

Бурачкі трэба прарэджваць больш дэталёва, пакідаючы адзін ад другога адлегласць у 6—10 см. Лісцікі, якія пажоўклі, пажадана абламаць — яны не працуюць на якасць прадукцыі, а толькі забіраюць сілкаванне.

Перац у доглядзе нічым не адрозніваецца ад памідораў: адрэзвайце пасынкі, здымайце ніжні ярус лістоў. Угнойвайце настоямі каравяку. Можна выкарыстаць попел і мачавіну. На вядро вады — адпаведна шклянку і сталовую лыжку.

Фасолю «карміць» не трэба. Асобныя кусты, якія пажаўцелі, зрэжце ля самай зямлі і пакладзіце на даспяванне. А вось гарох трэба падкарміць абавязкова курыным памётам (1:6) і шклянкай попелу на вядро вады.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

на право аренды земельного участка

Октябрьский районный исполнительный комитет Гомельской области сообщает о проведении аукциона

на право заключения договора аренды земельного участка

Предмет аукциона: право заключения договора аренды земельного участка.

Информация по лотам	Лот № 1
Кадастровые номера и адреса земельных участков, которые предполагается передать в аренду по результатам аукциона, их количество и размеры, целевое назначение	**кадастровый номер** земельного участка — 324055100001007185; **адрес:** Гомельская обл., г.п. Октябрьский, ул. Гоголя (район рынка); **площадь:** 0,0560 га; **назначение:** Земельный участок для строительства и обслуживания магазина.
Сроки аренды земельных участков	50 лет
Характеристика расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и инженерно-геологических условий	участок свободен от застроек
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	места и условия подключения к инженерным сетям определяются техническими условиями с учетом нагрузок на стадии изготовления проектно-сметной документации.
Начальная цена права заключения договора аренды	5 702 870 белорусских рублей

Аукцион проводится 7 сентября 2011 года в 10.00 в зале заседаний райисполкома (1 этаж) по адресу: Гомельская обл., г.п. Октябрьский, ул. Советская, 57 в соответствии с порядком, предусмотренным Положением о порядке организации и проведении аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Заявления и прилагаемые к ним документы принимаются в кабинете № 316 Октябрьского райисполкома со дня опубликования данного извещения по рабочим дням с 9.00 до 17.00 до 31 августа 2011 года.

Адрес и номер контактного телефона комиссии: 247319, Гомельская обл., г.п. Октябрьский, ул. Советская, 57, тел.: 802357 53472.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в указанный срок подает: заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду; заверенную копию платежного поручения о внесении задатка.

Кроме того, в комиссию представляются документы в соответствии с п. 12 Положения о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 года.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона.

Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты платежного документа для перечисления денежных средств и иные условия участия в аукционе:

задаток для участия в аукционе составляет 5% от стоимости предмета аукциона; **внесение задатка осуществляется** до подачи документов для участия в аукционе; заверенная копия платежного поручения о внесении задатка прилагается к заявлению на участие в аукционе;

реквизиты платежного документа для перечисления денежных средств: р/с 3641425000032, УНП 400007411, ОКПО 04063428, ЦБУ № 319 филиала № 312 ОАО «АСБ «Беларусбанк» в г.п. Октябрьский, МФО 673, назначение платежа 04002.

Подробная информация о **порядке осмотра земельных участков, расходах, подлежащих возмещению, условиях, предусмотренных в решении райисполкома** об изъятии земельных участков для проведения аукциона на официальном сайте Октябрьского райисполкома www.oktiabrskiy.gomel-region.by

Условия проведения аукциона: аукцион на право заключения договора аренды земельных участков проводится при наличии не менее двух участников в отношении предмета аукциона.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Факт

Шаравая маланка апаліла траіх

Шаравая маланка ўдарыла ў групу людзей, якія сядзелі на аўтобусным прыпынку ў вёсцы Малая Плотніца Пінскага раёна. Усяго на лаўцы сядзела чатыры чалавекі. Але пенсіянер, што прымасціўся збоку, пацярпеў менш за ўсіх, яму медыцынская дапамога не спатрэбілася. А вось 64-гадовая жанчына аказалася на бальнічным ложку ў аддзяленні кардыялогіі, а яе 32-х і 34-гадовыя аднавяскоўцы з апёкамі змешчаны ў траўматалогію.

Яна СВЕТАВА.

Пяць «валютных» спраў

Дэпартаментам фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю па Віцебскай вобласці заведзена пяць крымінальных спраў у дачыненні да валютчыкаў. І гэта толькі ў першым паўгоддзі бягучага года. У валютчыкаў канфіскавалі 491 тысячу расійскіх рублёў, 20,7 тысячы долараў ЗША, 15,5 тысячы еўра.

Калі ўсё канфіскаванае падлічыць у рублёвым эквіваленце, выходзіць, што прыватныя «валютныя банкіры» пабяднелі аж на 264,1 мільёна беларускіх рублёў. У дачыненні валютчыкаў склалі 14 адміністрацыйных пратаколаў і аштрафавалі на 5,3 мільёна «зайчыкаў».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Хабар за панчохі

Супрацоўнікі ўпраўлення КДБ па Брэсцкай вобласці, што называецца, за руку схапілі аднаго з кіраўнікоў структурнага падраздзялення Брэсцкага панчошнага камбіната, які атрымліваў ад камерцыйнай структуры працэнт ад сумы здзелкі. А здзелкай быў кантракт на пастаўку прадукцыі камбіната. Цяпер будзе праведзена следства і, хутчэй за ўсё, службовую асобу чакае турма.

Цікавым выглядае іншы факт. Яшчэ адносна нядаўна праблемай прадпрыемства былі поўныя склады і пошук патэнцыяльных пакупнікоў. А цяпер, аказваецца, за магчымасць купіць панчохі і шкарпэткі гатовыя хабар даваць.

Яна СВЕТАВА.

Усміхнемся!

— Дзяўчына, а што вы робіце сёння ўвечары?

— Бач ты, які нясмелы, а чаго вечара чакаць?!

☺

Калі паслухаць жанчыну, дык мужчыны падзяляюцца на дзве катэгорыі: разумныя, сэксапільныя, працавітыя, заможныя, і яе муж...

☺

2020 год. Пяцігадовы сын з мамай слухаюць рэкламу на радыё:

— Эфектыўны коўчынг па брэнд-менеджменту! Камунікацыі брэнда са спажыўцом. Фарміраванне аўтсорцінгавых пулаў у рэсечэ. Маніторынг дыстрыбуцыі. Вуліца Пушкіна, 25.

— Мама, а хто такі Пушкін?

☺

Дзевяцігадовы Валодзя вылаяўся матам каля мамы, якая скрэбла рыбу.

Мабыць, гэта адзіны выпадак, калі чалавек атрымаў ляшча карасём.

☺

Прараб звяртаецца да брыгады будаўнікоў:

— Сябры мае! Сёння пачнём! І памятайце: будуем грунтоўна, без крадзяжу матэрыялу, таму што будуем як мага лепш, таму што будуем для сябе.

— А што будаваць будзем?

— Выцвярэзнік!

АДКАЗЫ НА СКАНВОРД

Па гарызанталі: Віцьба. Пяро. Абрыкос. Хмара. Вус. Дзіно. Катэдра. Рада. Пагрэб. Анёр. Яблык. Куб. Іруша. Комплекс. Канцэрт. Тна. Ада. Запіт. Рыдлёвы. Кап. Антрацыт. Сайт. Шакал. Офіс. Доха. Сан. Кавалер. Пяцёрка. Зра. Атлянт. Пляж. Ядро. Старэц. Управа. Тул. Адам. Шыр. Яфар. Зра. Атлянт. Пляж. Ядро. Параход. Афон. Ауп. Цагік. Рукзак. Сак. Рэчак. Зэт. Астат. Бокра. Абак. Пліткіка. Гуру. Антай. Баса. Пгушкар.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.28	21.03	15.35
Віцебск —	5.12	20.58	15.46
Магілёў —	5.18	20.53	15.35
Гомель —	5.20	20.43	15.23
Гродна —	5.44	21.17	15.33
Брэст —	5.51	21.11	15.20

Месяц

Першая квадра 6 жніўня. Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Марыі, Магдаліны, Аляксея, Карнілы, Міхаіла, Фокі.*

К. *Дамініка, Пратаза, Яна.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

4 жніўня

1917 год — нарадзіўся (г. Адэса) Янка Брыль, народны пісьменнік Беларусі. Ганаровы акадэмік НАН Беларусі (1994). У 1922 годзе пераехаў з бацькамі на іх радзіму — у Гродзенскую вобласць. Скончыў польскую сямігодку, займаўся самаадукацыяй. У 1939 годзе быў прызваны ў польскую армію, у верасні трапіў у палон, адкуль уцёк у 1941 годзе. З 1942 года быў сувязным партызанскай брыгады імя Жукава, а з сакавіка да ліпеня 1944-га — партызан-разведчык брыгады «Камсамолец», рэдактар партызанскай газеты «Сцяг свабоды». Пасля вайны працаваў у рэдакцыях часопісаў «Вожык», «Маладосць», «Полымя», Дзяржаўным выдавецтве Беларусі. Быў сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Друкавацца пачаў у 1938 годзе. Сярод твораў: аповесці «У Забалоцці днее», «Золак, убачаны здалёк», раман «Птушкі і гнёзды». Адзін з аўтараў (разам з А. Адамовічам і У. Калеснікам) кнігі «Я з вогненнай вёскі ...». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1952), Літаратурнай прэміі імя Я. Коласа (1963), Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа (1982). Памёр у 2006 годзе.



1693 год — французскі манах Дом Перыньён адкрыў сакрэт вырабу шампанскага.

«Гарэлка бясколерная, але фарбуе нос ды чэрніць рэпутацыю».

Антон Чэхаў (1860—1904), рускі пісьменнік.

ГАРБУЗЫ

У апошнія дні сакавіка гаспадыні правяраюць насенне гарбузоў і падрыхтоўваюць яго да пасеву.

● Гарбузы заўсёды былі культурай абавязковай на стале і лічыліся надзейнымі і непатрабавальнымі. Іх пасевам пачыналіся сельскагаспадарчыя работы, іх зборам яны і заканчваліся. Гарбузамі кармілі свойскую жывёлу, з іх варылі смачныя духмяныя кашы, у працяглыя зімовыя вечары ласаваліся семкамі.

● Навукоўцы, калі даследавалі зярнятка гарбуза і зярнятка сланечніка, заўважылі, што ні ў адной расліне болей няма такога складу вітамінаў, амінакіслот і іншых рэчываў, якія так неабходны чалавеку.

● 100 грамаў сырых абабраных гарбузовых зярнятак, з'едзеных на пусты страўнік тры дні запар, цудоўна дапамагаюць дзецям пазбавіцца ад глістоў.

● Гарбузы таксама выкарыстоўвалі пры захворваннях печані і нырак, а таксама пры падагры.

● Кожная гаспадыня ведала, што «гарбузы садзяць, калі поўня, каб былі поўныя».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 3721. Нумар падпісаны ў 19.30 3 жніўня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.